Пасылку з інтэрнэт-крамы знойдзе... сканер

СТАР. 3

Таямніцы Чырвонага касцёла

СТАР. 5

Немец пазнае Беларусь праз творы Караткевіча

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

2 СНЕЖНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 228 (27838) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

БАЛТЫЙСКІ ІНТАРЭС

Узаемадзеянне нашай краіны і Калінінградскай вобласці вызначаецца высокай інтэнсіўнасцю на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сферах

На гэта звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Калінінградскай вобласці Мікалаем Цуканавым, паведамляе БЕЛТА.

Паводле слоў Прэзідэнта, пачынаючы з 2010 года двухбаковы тавараабарот стабільна расце, дасягнуўшы амаль $300 млн у 2013 годзе. «Але былі часы, калі мы дасягалі тавараабароту $0,5 млрд. Я думаю, мы маем права паставіць перад сабой задачу выйсці на той высокі ўзровень, які ў нас ужо быў: значыць, мы ўмеем працаваць на гэту лічбу і гэты ўзровень тавараабароту. На мой погляд, неабходна зрабіць усё магчымае для гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«У некаторых нашых ворагаў, у тым ліку ў Расіі (і ў Беларусі іх хапае), ідуць размовы аб тым, што Лукашэнка хоча ледзь не Калінінградскую вобласць далучыць да Беларусі. Паверце, у мяне такіх планаў няма. Але склалася добрая практыка яшчэ ў часы Савецкага Саюза, Беларусь заўсёды падстаўляла плячо Калінінградскай вобласці, мы ніколі яе чужой не лічылі. А ў якім складзе, у якой дзяржаве будзе Калінінградская вобласць пры такіх падыходах, напэўна, не так важна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы не супраць пашыраць сваю прысутнасць у вас у сферы будаўніцтва, асабліва напярэдадні 2018 года, калі ўся Калінінградская вобласць будзе рыхтавацца да чэмпіянату свету па футболе. Гэта добрае мерапрыемства, якое любому рэгіёну заўсёды дае штуршок да развіцця», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова, калі будзе неабходна, падзяліцца вопытам і дапамагчы.

Беларусь таксама гатова падзяліцца з Калінінградскай вобласцю вопытам у меліярацыі. «Вы можаце выкарыстаць гэты вопыт, калі вам трэба. Мы можам дапамагчы не толькі тэхнікай, але і перадаць на практыцы вопыт у меліярацыі зямель, таму што без меліярацыі ў Калінінградскай вобласці ніякай сельскай гаспадаркі быць не можа. Калі будзе праведзена правільна меліярацыя, вы не толькі сябе забяспечыце прадуктамі харчавання, але і зможаце прадаваць іх у любым рэгіёне, перш за ўсё — у Расійскай Федэрацыі», — лічыць Прэзідэнт.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што калі ў Калінінградскай вобласці будзе неабходнасць, то Беларусь гатова пастаўляць харчовыя тавары ў патрэбных аб'ёмах.

«Мы таксама гатовы развіваць з вамі вытворчую кааперацыю ў сферы прамысловасці. Трэба проста рухацца наперад, не спасылаючыся ні на якія складанасці, цяжкасці і праблемы. Ніякіх санкцый фактычна няма, трэба проста ў гэтай сітуацыі навучыцца жыць і працаваць», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

На сустрэчы абмеркавана рэалізацыя як існуючых праектаў, так і перспектыўных. Губернатар запрасіў беларускія кампаніі больш актыўна прымаць удзел у тэндарах, якія праводзяцца ў Калінінградскай вобласці.

Мікалай Цуканаў адзначыў, што вобласць разлічвае на дапамогу Беларусі па такіх напрамках, як меліярацыя, узаемадзеянне ў вытворчай кааперацыі, у сферы будаўніцтва. Ён таксама прапанаваў зрабіць больш доўгатэрміновымі кантракты на пастаўку беларускіх прадуктаў харчавання.

БАР'ЕРАМ ТУТ НЕ МЕСЦА

У Беларусі разлічваюць, што ў ЕАЭС тавары ўсіх краін-удзельніц будуць прыраўноўвацца да айчынных

Аб гэтым заявіў на дванаццатым пасяджэнні беларуска-расійскага Савета па доўгатэрміновым супрацоўніцтве абласцей, міністэрстваў, органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі з Калінінградскай вобласцю Расіі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Пётр Пракаповіч, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Дагаворна-прававая база ЕАЭС прадугледжвае роўнасць краін-удзельніц. «Спадзяёмся, што ў бліжэйшы час у ЕАЭС усё ж такі будзе прынята рашэнне, што айчынны тавар — гэта той тавар, які выпускаецца ў рамках усяго саюза», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Землякі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Староста вёскі Каляды Вілейскага раёна Іосіф Браніслававіч ЖУРАЎСКІ любіць пакатаць сваіх «гарадскіх» аднавяскоўцаў, якія ў выхадныя не ўпускаюць магчымасці наведаць родны куток.

ЦЫТАТА ДНЯ

Лявонцій ПАПЯНОК, генеральны дырэктар транспартнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінсктранс»:

«У 2015 годзе ў Мінску неабходна ўвесці ў абарачэнне новыя віды праязных: выхаднога і буднага дзён, на далёкасць паездкі і гэтак далей. Пры дзейным тарыфе аплаты за праезд у памеры Br4 тыс. сабекошт перавозкі аднаго пасажыра ў кастрычніку ў наземным транспарце горада склаў Br8,4 тыс., на метро — Br7,1 тыс. Акупнасць перавозак у грамадскім транспарце Мінска за дзесяць месяцаў бягучага года склала 48,6%, у тым ліку па метрапалітэне — 57,9%, наземным транспарце — 43,7%. Дзяржпрадпрыемства «Мінсктранс» абслугоўвае 188 гарадскіх аўтобусных, 59 тралейбусных, 9 трамвайных маршрутаў і дзве лініі метро. Паслугамі гартранспарту ў Мінску штодня карыстаюцца больш за 2 млн чалавек».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.12.2014 г.

Долар ЗША	10810,00	■
Еўра	13450,00	▼
Рас. руб.	209,50	▼
Укр. грыўня	719,75	▲

Авалодаць словам і сучаснымі тэхналогіямі

■ Журфаку — 70

Студэнты Інстытута журналістыкі БДУ змогуць стажыравацца ў Германіі і вучыцца некалькі гадоў па абмене ў Кітаі

Што агульнага ў пісьменніцы Святланы Алексіевіч, кінарэжысёра Ігара Дабралюбава і тэлевядучай Алены Спірыдовіч? Усе яны ў свой час скончылі факультэт журналістыкі БДУ, як і многія іншыя вядомыя людзі. Сёння факультэт адзначае 70-годдзе. Дырэктар Інстытута Сяргей ДУБОВІК расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе», ці паспявае адукацыя за развіццём інфармацыйных тэхналогій, у чым адметнасць беларускай журналістыкі і што трэба, каб стаць сапраўдным прафесіяналам.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Сяргей Валянцінавіч, ёсць думка, што, каб стаць журналістам, не патрэбна журналісцкая адукацыя. Лепш, напрыклад, скончыць юрыдычны факультэт, стаць спецыялістам у сваёй сферы, а потым на гэтую тэму пісаць. Вы пагодзіцеся ці паспрачаецеся?

— Практыка паказвае, што людзі, якія па прафесіі з'яўляюцца журналістамі, як правіла, лепш выконваюць свае непасрэдныя абавязкі. Журналіст працуе са словам, яму трэба ўмець пісаць тэксты. У таго, хто вучыўся на іншую спецыяльнасць, гэтых ведаў можа не быць. Зразумела, што, каб пісаць пра эканоміку, недастаткова толькі той інфармацыі, што дае факультэт журналістыкі. Трэба дэталёва разбірацца ў банкаўскай дзейнасці, механізмах функцыянавання рынку. Калі чалавек бярэ інтэрв'ю ў міністра эканомікі, ён павінен размаўляць на роўных, не быць дылетантам у тэме. Журналісцкая адукацыя — гэта база. А ўжо далейшае развіццё выпускніка як спецыяліста — яго самаадукацыя, жыццёвы вопыт.

СТАР. 4

■ Энергетычная бяспека

НАШУ АЭС МАРАЗАМІ НЕ СПУЖАЕШ

Нават экстрэмальнае надвор'е не паўплывае на работы па ўзвядзенні станцыі

Наш журналісцкі дэсант у Астраўцы надвор'е сустракала моцным ветрам, невялікім марозам і мокрым снегам. Аднак тут ніхто не хаваўся ад сцюжы, а будоўля нагадвала гіганцкі мурашнік, дзе кожны работнік дакладна ведае сваю задачу. Бліжэйшая ад нас брыгада ўсталёўвала на аб'екце вялізную металічную канструкцыю, потым іншыя работнікі залівалі туды цэмент. Праца не спынялася ні на імгненне. Ніхто тут занадта не спяшаўся, але і ні ў кога не ўзнікала жадання «пакурыць». Сур'ёзная і адказная праца не церпіць мітусні...

Мае калегі даволі хутка змерзлі, а потым пачала «глючыць» іх тэлевізійная тэхніка. Нам адразу стала цікава, а пры якой температуры паветра на гэтай пляцоўцы ўзвядзенне аб'ектаў прыпыняць? **Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Беларуская АЭС» Андрэй БАРКУН** паведаміў нам, што нават экстрэмальныя тэмпературныя ўмовы (маразы да мінус 30 градусаў) не паўплываюць на графік правядзення адпаведных работ. Кантракты з будаўнічымі трэстамі прадугледжваюць такі аб'ём фінансавання, які дазваляе ажыццяўляць цэментаванне ці іншыя «аперацыі» на працягу ўсяго года нават без мінімальных перапынкаў. Зразумела, што будуць прадугледжаны розныя хімічныя дабаўкі ў бетон, але пры неабходнасці спецыялісты ўзвядуць на аб'екце спецыяльнае «тэмпературнае футра».

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

На выбарах у Малдове наперадзе сацыялісты

На выбарах у парламент Малдовы перамагаюць камуністы і сацыялісты. Па апошніх звестках, шасціпрацэнтны бар'ер пераадольваюць пяць партый. На першым месцы — Партыя сацыялістаў, якую ўзначальвае Ігар Дадону. На другім — Партыя камуністаў на чале з былым прэзідэнтам краіны Уладзімірам Варонініым. Асноўная інтрыга выбараў заключаецца ў тым, ці ўдасца апазіцыйным левым сілам, якія выступаюць за еўразійскую інтэграцыю, атрымаць перавагу над каліцыяй кіруючых празаходніх партый. Самыя першыя вынікі сведчылі аб відавочнай перамозе апазіцыі, аднак па меры таго, як працэнт падлічаных галасоў павялічваецца, вынік празаходніх партый паказвае тэндэнцыю да росту, а левых сіл — да зніжэння.

Прэзідэнтам Уругвая стаў прадстаўнік кіруючай кааліцыі

У другім туры выбараў прэзідэнта Уругвая перамог 74-гадовы Табарэ Васкес, прадстаўнік кіруючай кааліцыі левых сіл — Шырокага фронту. Шырокі фронт знаходзіцца ва ўладзе з 2005 года, калі Васкес у першы раз заняў пасаду прэзідэнта. Падчас першага прэзідэнцкага тэрміну яго рэйтынг папулярнасці даходзіў да 70%. Устойліваму эканамічнаму росту спрыяла палітыка новых уладаў, у якой спалучаліся як меры, якія стымулююць бізнес, так і рэалізацыя праграм, накіраваных на сацыяльную абарону насельніцтва.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Табарэ Рамона Васкеса Росаса ў сувязі з перамогай на выбарах Прэзідэнта Усходняй Рэспублікі Уругвай. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

У брытанскім горадзе за восем месяцаў зніклі 211 кошак

У горадзе Іпсуіч на ўсходзе Вялікабрытаніі за апошнія восем месяцаў зніклі 211 кошак, адзначае The Daily Mirror. Для каардынацыі пошуку жывёл мясцовыя жыхары стварылі супольнасць у Facebook, якая налічвае каля 2,6 тысячы чалавек. Падчас патрулявання вуліц у мінулым месяцы група добраахвотнікаў заўважыла жанчыну, якая падзывала дзвюх кошак да сваёй машыны. Пасля таго, як жывёліны падышлі дастаткова блізка, яна схапіла іх і змясціла ў аўтамабіль. Жыхары горада перадалі інфармацыю пра інцыдэнт паліцыі, аднак супрацоўнікам правапарадку не ўдалося адшукаць ні жанчыну, ні кошак. За некалькі месяцаў актывісты не змаглі выявіць слядоў зніклых жывёл. Добраахвотнікі мяркуюць, што кошак выкарыстоўваюць для трэніроўкі байцоўскіх сабак (кошкі выступаюць у якасці здабычы).

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Самае дарагое лякарства ў свеце — прэпарат геннай тэрапіі

Першы на Захадзе прэпарат геннай тэрапіі будзе прадавацца ў Германіі. Кошт поўнага курса лячэння складзе 1,1 мільёна еўра. Лякарства прызначана для тэрапіі рэдкага генетычнага захворвання — дэфіцыту ліпапратэінліпазы. Пра гэта паведаміла The Guardian. Яно дапамагае ад дэфіцыту ферменту ліпапратэінліпазы, які рэгулюе ўзровень ліпідаў у крыві: з-за дэфектнага гена гэтае рэчыва не выпрацоўваецца арганізмам, і існуе рызыка закупорвання крывяносных сасудаў чалавека. Ва ўсёй Еўропе колькасць патэнцыйных пацыентаў не перавышае 150-200 чалавек. Абаронцы новых метадаў лячэння паказваюць, што курс лячэння Glybera абыдзецца танней, чым некалькі сеансаў ферментазамяшчальнай тэрапіі, бо ён здольны цалкам вылечыць чалавека.

КАРОТКА

Рассельгаснагляд выставіў прэтэнзіі да Мёрскага мясакамбіната, які не пастаўляе сваю прадукцыю ў Расію апошнія паўтара года.

Амаль 350 адзінак спецыяльнай тэхнікі будуць штодзённа задзейнічаны ў прыбіранні зімовага Мінска.

У Беларусі з 1 снежня субсідзіруемыя дзяржавай тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі выраслі на 5,8 працэнта.

Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац паставіў задачу знізіць кошт пражывання ў трох- і чатырохзоркавых гасцініцах Мінска, бо на сёння ён вышэйшы, чым у атэлях Варшавы, Вільнюса, Рыгі.

Беларусь можа страціць амаль $100 млн з-за сітуацыі з пастаўкамі прадукцыі ў Расію. Аб гэтым паведаміў першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Марыніч.

Некаторыя віды цыгарэт у Беларусі з 1 снежня падаражэлі на 2,3 працэнта — 3,1 працэнта, паведамілі ў Міністэрстве па падатках і зборах рэспублікі.

■ Надвор'е

ЗІМА СТАРТУЕ ХАЛАДАМІ

На выхадныя пацяплее, аднак чакаецца снег і слабы галалёд

Першы тыдзень снежня пройдзе ў нас пад знакам халоднага скандынаўскага антыцыклону, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму з 2 па 5 снежня на тэрыторыі краіны істотных ападкаў не будзе. Месцамі чакаецца слабы туман і намаразь, на асобных участках дарог галалёдзіца. У аўторак максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад 3 да 9 марозу. Уначы на сераду стане яшчэ халадней, калі чакаецца мінус 6-13 градусаў, а па паўднёвым усходзе пры праясненнях — да 15 марозу. Удзень — 1-7 градусаў ніжэй за нуль. У чацвер і пятніцу маразы крыху адпусцяць. Уначы чакаецца мінус 3-10 градусаў, пры праясненнях — да 11-13 марозу. Удзень будзе ад 0 да мінус 7 градусаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітаюць паветраныя масы з боку Атлантыкі і стане яшчэ цяплей. Таму ў суботу месцамі, а ў нядзелю амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя ападкі (снег і мокры снег). Месцамі галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на суботу чакаецца ў межах ад 2 да 9 марозу, удзень — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Парламенцкі дзённік

ЁСЦЬ ДА ЧАГО ІМКНУЦЦА

Таваразварот з Сербіяй павінен вырасці да паўмільярда долараў

На гэтай мэце ў эканамічных стасунках паміж дзяржавамі зрабіў акцэнт Анатоль Рубінаў, старшыня Савета Рэспублікі, падчас сустрэчы з першым намеснікам старшыні ўрада — міністрам замежных спраў Сербіі Івіцам Дачычам.

— Ваш візіт — гэта сведчанне таго, што супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Сербіяй пашыраецца, — заўважыў у пачатку сустрэчы Анатоль Рубінаў.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадаў, што летась нашу краіну наведаў Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Ніколіч, а сёлета беларускі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў Сербію. Гэта, безумоўна, надало імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву ў розных сферах.

— У стасунках Беларусі і Сербіі важную ролю адыгрывае эканоміка, — адзначыў Анатоль Рубінаў. — Трэба адзначыць, што падпісанне ў 2009 годзе пагаднення аб свабодным гандлі паміж нашымі краінамі мела вялікае значэнне. За гэты час у тры з паловай разы павялічыўся наш таваразварот, за мінулы год ён склаў амаль 200 мільёнаў долараў. Цяпер стаіць задача давесці таваразварот да 500 мільёнаў.

Па словах старшыні верхняй палаты, краіны маюць добрыя прыклады супрацоўніцтва не толькі ў сферы гандлю, але і ў сферы інвестыцый, стварэння сумесных вытворчасцяў. На тэрыторыі нашай краіны — гэта буйныя будаўнічыя праекты ў Мінску, у Сербіі ёсць зборачныя вытворчасці беларускай тэхнікі.

— Стасункі паміж нашымі краінамі вельмі добра развіваюцца на вышэйшым узроўні, — лічыць Анатоль Рубінаў. — У той жа час паміж кіраўнікамі парламентаў трывалыя кантакты па-куль не наладжаны. Прыйшоў час павысіць узровень нашага парламенцкага ўзаемадзеяння.

У сувязі з гэтым старшыня Савета Рэспублікі выказаў спадзяванні, што яго калега з сербскага боку Майя Гойкавіч пацвердзіць накіраванае раней запрашэнне наведаць Беларусь з афіцыйным візітам.

Івіца Дачыч пагадзіўся з тым, што стасункі паміж Беларуссю і Сербіяй вельмі сяброўскія.

— Паміж Беларуссю і Сербіяй няма спрэчных пытанняў, — заявіў сербскі дыпламат. Што да палітычнага ўзроўню супрацоўніцтва, то, я лічу, неабходна працягнуць гэтыя добрыя тэндэнцыі.

Таксама Івіца Дачыч паабяцаў перадаць кіраўніку парламента Сербіі запрашэнне старшыні Савета Рэспублікі наведаць нашу краіну.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ПРЫМІРЫЦЦА І ДАРАВАЦЬ

Ці прыжывецца ў нас інстытут медыяцыі?

У Палаце прадстаўнікоў дэпутаты абмеркавалі неабходнасць укаранення практыкі медыяцыі ў крымінальны і крымінальна-працэсуальны кодэксы. Унясенне папраўак — ініцыятыва Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.

За «круглым сталом» тэму абмяркоўвалі таксама члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі судовай сістэмы, сілавых структур, псіхолагі ды іншыя зацікаўленыя бакі.

Прапанаваныя змены датычацца асоб, якія вядуць крымінальны працэс, — дазнавальніка, следчага і суддзі. Яны будуць абавязаны патлумачыць удзельнікам канфлікту правілы правядзення перамоў пры дапамозе медыятара. Калі бакі згодны, медыятар атрымлівае магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі справы. Пры станоўчым выніку пагадненне бакоў будзе далучана да крымінальнай справы. Пакуль адпаведныя папраўкі ў кодэксы знаходзяцца на этапе абмеркавання.

Трэба адзначыць, што змены не датычацца цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў. Мяркуецца, што медыяцыя будзе распаўсюджвацца на тыя справы, якія не маюць грамадскай цікавасці, і менш цяжкія. Напрыклад, гэта можа быць абраза.

— Папраўкі звязаны з рэалізацыяй дзяржаўнай палітыкі ў сферы заканадаўства і аднаўленчага правасуддзя, — заўважыў **старшыня парламенцкай камісіі Уладзімір ЧАРАВАЧ.** — Сутнасць канцэпцыі — у прымірэнні і альтэрнатыўным спосабе вырашэння канфліктаў.

Па словах Уладзіміра Чаравача, самай распаўсюджанай формай такога падыходу з'яўляецца медыяцыя. Галоўным вынікам яе становіцца абарона парушаных правоў пацярпелага.

Падчас мерапрыемства былі абмеркаваны не толькі заканадаўчыя папраўкі. Выступоўцы абгрунтоўвалі неабходнасць інстытута медыяцыі і яго месца ў судовай сістэме і грамадстве.

— Амаль кожны мужчына, калі ўзгадае сваё юнацтва, зможа назваць хоць адну бойку дзесьці на вёсцы, — тлумачыць сутнасць медыяцыі **старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар ЧАЙЧЫЦ.** — Па вялікім рахунку, за гэта ён мог бы быць прыцягнуты да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці. Але пабіліся, ніхто не заўважыў, а раніцаю ўжо прымірыліся. Такім чынам, адбыўся працэс медыяцыі.

На думку Віктара Чайчыца, міліцыянер Аніскін з фільма «Вясковы дэтэктыў» — тыповы прыклад нефармальнага медыятара. Прыведзеныя прыклады паказваюць, што практыка прымірэння ўжо існуе. Застаецца замацаваць яе ў заканадаўстве.

— Сучасная практыка крымінальнага судаводства абапіраецца на сістэму пакаранняў, — тлумачыць **кандыдат юрыдычных навук, дацэнт Людміла ЗАЙЦАВА.** — І яна павінна нібыта ўсталёўваць мір паміж дзяржавай, пацярпелым і злачынцам. У дачыненні да цяжкіх і асабліва цяжкіх спраў так і павінна быць.

Людміла Зайцава лічыць, што да менш цяжкіх сфер парушэнняў закону лепш прымаць гуманістычную, сацыяльна-арыентаваную мадэль пасярэдніцтва, да якой адносіцца і медыяцыя. Тады пацярпелы атрымлівае не толькі матэрыяльную кампенсацыю, але і маральную. А гэта ўжо падыход не ціску, а аднаўлення.

Часцей за ўсё нефармальным медыятарам у судовай справе выступае маці ці жонка парушальніка закону. Яна вырашае канфлікт паміж бакамі. Нярэдка ў грашовым эквіваленце. Хоць насамрэч размовы, сапраўднага прымірэння і раскаяння паміж вінаватым і пацярпелым не адбываецца.

— Аснова медыяцыі — хрысціянскія каштоўнасці, такія як пакаянне, дараванне, адпушчэнне грахоў, — дадала Людміла Зайцава.

Нагадаем, што ў нашай краіне ўжо існуе «Цэнтр медыяцыі і перамоў». Ён аб'ядноўвае прафесіяналаў-практыкаў і тых, хто толькі збіраецца імі стаць. Паводле заканадаўства, медыятарам можа з'яўляцца асоба і без юрыдычнай адукацыі. Напрыклад, псіхолаг ці педагог.

Трэба адзначыць, што закон аб медыяцыі быў прыняты 12 ліпеня 2013 года. Тым самым былі зроблены першыя крокі да прававога замацавання практыкі медыяцыі. У кастрычніку гэтага года прайшоў тыднёвы форум, прысвечаны даволі новай для Беларусі з'яве.

Вераніка ПУСТАВІТ

■

ХАРЧАВАННЕ Ў ДЗІЦЯЧЫХ САДКАХ ДАРАЖЭЕ

У снежні грашовая сума, якую бацькі ўносяць за харчаванне сваіх дзяцей у дашкольных установах, крыху падрасце.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне дзяцей у дашкольных установах павялічыліся. Адпаведна павялічацца і выдаткі бацькоў, якія з красавіка бягучага года сталі пакрываць кошт набору прадуктаў харчавання ў поўным аб'ёме (усе 100 працэнтаў выдаткаў). Трэба патлумачыць, што сума бацькоўскай платы «прывязана» да грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне. Апошнія рэгулярна пераглядаюцца беларускім урадам. І калі павышаюцца грашовыя нормы на харчаванне — прапарцыянальна павышаюцца і выдаткі бацькоў.

Згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 26 лістапада 2014 года № 1104, грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне ў дашкольных установах павялічыліся.

Так, ва ўстановах з працягласцю знаходжання 10,5 гадзіны выдаткі на харчаванне дзяцей ва ўзросце 1–2 года павялічваюцца з 14010 да 15410 рублёў, а ва ўзросце ад 3 да 5 гадоў — з 17770 да 19550 рублёў.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі з 12-гадзінным рэжымам працы харчаванне ў ясельных групах падаражэла з 18260 рублёў да 20090 рублёў; для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — з 22030 да 24230 рублёў.

Змяніўся таксама і кошт харчавання выхаванцаў санаторных ясляў-садкоў, санаторных груп і Рэспубліканскага цэнтра для дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху з працягласцю знаходжання ад 12 да 24 гадзін. Для дзяцей ва ўзросце 1–2 гадоў кошт павялічыўся з 20940 рублёў да 23030 рублёў. Для дзяцей 2–6 гадоў — з 26350 рублёў да 28990 рублёў.

Грашовыя выдаткі на харчаванне ў дашкольных установах на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання з працягласцю знаходжання 10,5 гадзіны павысіліся для дзяцей 1–2 гадоў з 16550 рублёў да 18210 рублёў, для дзяцей 3–6 гадоў — з 21510 да 23660 рублёў. У малодшых групах, дзе дзеці знаходзяцца 12 гадзін, нормы ўзняліся з 19600 да 21560 рублёў, а ў групах з дзецьмі ад 3 да 6 гадоў — з 25130 да 27640 рублёў.

Рашэнне ўрада аб павышэнні грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне закранула таксама цэнтры карэкцыйна-развіццёва-

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

га навучання і рэабілітацыі, школы, гімназіі і ліцэі.

Нагадаем, што апошні раз грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне ва ўстановах адукацыі пераглядаліся ў маі бягучага года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НАШУ АЭС МАРАЗАМІ НЕ СПУЖАЕШ

Станцыя мае свой бетонны завод

Увогуле для бетанавання ўнутранай ахоўнай абалонкі будынка рэактара энергаблока №1 выкарыстоўваецца высакамарачны бетон сапраўды вышэйшай трываласці. Увесь гэты бетон вырабляецца побач на ўласнай вытворчай базе, размешчанай на дапаможнай пляцоўцы станцыі. Гэты завод дазваляе атрымліваць да 180 кубічных метраў бетону за гадзіну. Асабіста мне такі аб'ём бетону за гадзіну нават уявіць складана. А тут усе гэтыя будматэрыялы выкарыстоўваюць, як той казаў, з колаў. Каб вы ўявілі маштабы пляцоўкі, прывяду толькі адзін факт. Тут адначасова працуе каля 40 буйных кранаў.

Графік выконваецца «па гадзінніку»

Андрэй Баркун адзначыў, што будаўніцтва станцыі ў Астраўцы ідзе выключна па графіку. У прыватнасці, на будаўніцтве надземнай часткі будынка рэактара першага энергаблока пераадолена мяжа плюс 9,4 метра. Да канца бягучага года плануецца выйсці на адзнаку плюс 22 метры, дзеля чаго неабходна змацаваць не менш за 33 тысячы тон арматуры і абкласці яе 183 тысячамі кубічных метраў бетону.

Што тычыцца знакавых аперацый на пляцоўцы, то мантаж прылады лакалізацыі расплаву энергаблока №2 на БелАЭС будзе пачаты налета ў сакавіку. Намеснік гендырэктара ўдакладніў, што аналагічная прылада блока №1 ужо ўстаноўлена ў шахту рэактара, а цалкам змацаваць першую пастку расплаву на атамнай станцыі разлічваюць у бліжэйшыя месяцы. Прылада лакалізацыі расплаву актыўнай зоны ўяўляе сабой спецыяльную сістэму абароны атамнай станцыі. Яе выкарыстанне дазволіць нават у самай экстраннай сітуацыі не дапусціць небяспечнай уцечкі радыеактыўных элементаў за межы корпуса прылады ў навакольнае асяроддзе.

У снежні — яшчэ 300 будаўнікоў

Менавіта на працягу гэтага месяца на галоўных пляцоўках БелАЭС плануецца павялічыць колькасць будаўнічага персаналу да 3,5 тысячы чалавек. Пры гэтым доля ўдзелу беларускіх будаўнічых арганізацый складзе больш за 85%, упэўнены

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Даведка

Беларуская АЭС будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2400 (2х1200) МВт. Для яе будаўніцтва выбраны самы сучасны ў свеце праект «АЭС-2006», які цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. У адпаведнасці з генеральным кантрактам на будаўніцтва станцыі першы энергаблок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2018 годзе, другі — у 2020 годзе.

Андрэй Баркун. Лічыцца, што ў лістападзе на пляцоўцы атамнай станцыі ў нас працавала каля 3,2 тысячы рабочых. Андрэй Баркун звярнуў увагу, што спецаперацыі на рэактарнам аддзяленні выконвае расійская кампанія. У складзе групы «рэактарных спецыялістаў» (гэта каля 540 чалавек), прыкладна 150 работнікаў з'яўляюцца мясцовымі жыхарамі, астатнія — расіяне і ўкраінцы.

Што тычыцца будаўнічых спецыяльнасцяў, то цяпер сярэдні заробак такога персаналу БелАЭС складае каля 8 млн рублёў. Намеснік генеральнага дырэктара ўдакладніў, што сапраўды кваліфікаваныя спецыялісты могуць атрымліваць па 10-15 ці нават да 20 млн рублёў.

Для забеспячэння будаўнікоў жыллём рэалізуецца праграма жыллёвага будаўніцтва. Сёлета ўжо ўведзена ў эксплуатацыю 5 дамоў агульнай плошчай 17,7 тысячы квадратных метраў, што дазволіла забяспечыць камфортнымі ўмовамі звыш 1,1 тысячы чалавек. Да канца года плануецца здаць яшчэ 3 жылыя дамы.

У Астраўцы свядома адмовіліся ад часовага жылля. Сёння нават будаўнікоў рассяляюць у паўнавартасныя двухпакаёвыя і трохпакаёвыя кватэры па пяць-сем чалавек. Калі іх місія скончыцца, кватэры зоймуць сем'і спецыялістаў па эксплуатацыі АЭС.

Агульны кошт АЭС можа нават знізіцца

Паміж урадамі Беларусі і Расіі заключана пагадненне аб прадастаўленні крэдыту на будаўніцтва БелАЭС. Кошт кантракта пакуль не ўдакладняецца, бо ён можа залежаць ад мноства фактараў. Намеснік гендырэктара толькі адзначыў, што агульная цана станцыі не перавысіць 11 млрд долараў. Мяркуецца, удакладніў ён, што расійскі крэдыт у памеры каля 10 млрд долараў пакрые 90% усіх работ па ўзвядзенні Беларускай АЭС. На станцыі выканана і прафінансавана 12,5% работ. Цяпер у сярэднім за месяц выконваецца аб'ём работ на суму каля 60 млн долараў. Андрэй Баркун пры гэтым заявіў, што дэвальвацыя расійскага рубля не адаб'ецца неспрыяльным чынам на праекце. «Крэдытнае пагадненне падпісана ў доларах, таму курс расійскага рубля нас не асабліва і хвалюе», — канстатаваў ён.

Больш за тое, Андрэй Баркун удакладніў, што аплата па кантракце ажыццяўляецца ў расійскіх рублях, і нам гэта нават выгадна. Магчыма, што ў сувязі з гэтым агульны кошт нашай станцыі для бюджэту краіны крыху паменшыцца.

Станцыя ўсю ваду з Вілііі не «з'есць»

Электрычнасць на станцыі будуць вырабляць сучасныя парагенератары. Гэтую пару трэба потым неяк ахаладжваць. Дзеля гэтага тут будуюцца дзве велізарныя градзірні, дзе пар і гарачая вада будуць сустракацца з халодным паветрам. Пасля чаго вада зноў трапіць у сістэму ахаладжвання. Для дакладнай работы рэактараў у сістэме павінна заўсёды прысутнічаць не менш за 8

тысяч кубічных метраў вады. Гэты аб'ём вады будзе брацца з ракі Вілія. Адабранне вады з ракі будзе пастаянным, бо неабходна падтрымліваць пастаянны ўзровень ціску ў сістэме. Нам растлумачылі, што галоўныя страты вады ў сістэме будуць назірацца менавіта ў градзірні за кошт выпарэння вады. Вось тут і ўзнікаюць экалагічныя пытанні. Ці не вельмі вялікія апетыты на ваду ў нашай станцыі для мясцовай ракі?

Інстытут водных рэсурсаў Беларусі на гэты конт зрабіў свой дакладны аналіз. Навукоўцамі было высветлена, што воднасці Вілііі хопіць для беспраблемнага функцыянавання васьмі падобных атамных энергаблокаў. А ў нас іх будзе дзейнічаць толькі два. Менавіта для «зялёных» асобна хачу патлумачыць, што ўзятая з Вілііі вада робіць пастаянны кругаварот па сістэме, а назад у раку не трапляе. Выключэнні складаюць толькі некалькі разоў на год, калі сістэма паэтапна правяраецца. Менавіта тады невялікая частка вады будзе скідвацца ў Вілію. Аднак і гэтая вада ніякім чынам у сістэме з радыяцыяй не сутыкаецца. Узнікалі пытанні, што такія аб'ёмы вады могуць трапляць у раку ў гарачым стане. Спадар Баркун запэўніў нас, што менавіта для выключэння цеплавога ўздзеяння на прыроду і будуць дадаткова пабудаваны на скідзе пырскальныя басейны. Таму ніякага цеплавога ці хімічнага ўздзеяння атамная станцыя на раку рабіць не будзе, лічыць намеснік гендырэктара БелАЭС.

Сучасны турыстычны аб'ект

Будаўніцтва атамнай станцыі выклікае вялікую цікавасць грамадскасці. Толькі сёлета за 11 месяцаў у якасці турыстаў на будаўнічай пляцоўцы БелАЭС пабывала каля 1250 чалавек. Экскурсіі арганізуюцца абавязкова па папярэдняй заяве. Даволі актыўна наведвалі пляцоўку атамнай станцыі студэнты, школьнікі, настаўнікі і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Беларуская АЭС практыкуе правядзенне экскурсій і тэхнічных тураў на будаўнічую пляцоўку ў Астраўцы ў адпаведнасці з палітыкай супрацоўніцтва і інфармацыйнай адкрытасці. Арганізацыю экскурсій на аб'екты БелАЭС падчас наведвання гістарычных месцаў Астравецкага раёна прапануе адна з турыстычных кампаній Мінска. Заўважу, што грошы за арганізацыю такіх экскурсій спецыялісты будучай АЭС з наведвальнікаў не бяруць.

Сяргей КУРКАЧ.

Мінск — Астравец — Мінск.

■ Меркаванне

КАМУ ПАТРЭБНЫ «ХАРЧОВЫЯ ВОЙНЫ»?

У гандлёва-эканамічных стасунках паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй узніклі чарговыя цяжкасці. З канца лістапада рашэннем Рассельгаснагляду быў абмежаваны экспарт прадукцыі шэрагу айчынных прадпрыемстваў харчовай прамысловасці на расійскі рынак, а таксама забаронены транзіт беларускай прадукцыі праз тэрыторыю РФ у трэція краіны.

У якасці прэтэнзій расійскага кантрольнага органа гучаць як невыкананне патрабаванняў бяспекі беларускімі вытворцамі мясных і малочных прадуктаў, а таксама падазрэнні ў арганізацыі схем рээкспарту з краін Еўрасаюза, у дачыненні да якіх Расія ўвяла эканамічныя санкцыі.

Сітуацыя выглядае надзвычай дзіўна з улікам таго, што згодна з дагаворамі аб Саюзнай дзяржаве, Мытным саюзе паміж краінамі існуе свабоднае перамяшчэнне тавараў, прытым не толькі паміж Расіяй і Беларуссю, але таксама і з Беларусі ў Казахстан праз тэрыторыю Расіі. Фактычна аднабаковае ўвядзенне расійскім бокам мытнага кантролю на падставе ўсяго толькі «падазрэнняў» не толькі нясе эканамічныя страты для беларускіх прадпрыемстваў, іх партнёраў у Расіі, Казахстане і іншых краінах, але супярэчыць дагаворам аб адзінай мытнай прасторы, падрывае сам прэстыж інтэграцыі напярэдадні старту Еўразійскага эканамічнага саюза.

Падобна на тое, што буйны расійскі бізнес сапраўды паверыў у магчымасць атрымліваць сур'ёзныя барышы, займаючыся рээкспартам з беларускіх пазіцый, а інструментам ціску, як ужо не раз бывала, выступіла дзяржаўная кантрольная ўстанова — гэтым разам Рассельгаснагляд.

Вынікае, што любыя дагаворы могуць быць фактычна дэнансаваны нават без неабходнай юрыдычнай працэдуры, калі на тое будзе палітычная воля ці «падазрэнні» кантрольных арганізацый. Такім чынам, дзеянні Рассельгаснагляду ствараюць небяспечны прэцэдэнт, што можа вельмі негатыўна адбіцца на будучыні еўразійскай інтэграцыі.

БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ?

Як заўжды бывае, калі Рассельгаснагляд раптам знаходзіць якую-небудзь «шкоду» ў грузінскіх, малдаўскіх, літоўскіх ці беларускіх прадуктах харчавання, да кампаніі дыскрэдытацыі падключаецца расійская прэса. Шматлікія журналісцкія «расследаванні», каментарыі «экспертаў», часта беспадстаўныя абвінавачанні вядуць да таго, што чыста ведамаснае эканамічнае пытанне выносіцца на ўзровень міждзяржаўных стасункаў.

Пры гэтым, калі ў афіцыйнай заяве Рассельгаснагляду гаворыцца пра тое, што «існуюць падазрэнні, што пад выглядам беларускай прадукцыі можа быць арганізаваны рээкспарт тавараў санкцыйнай групы», то публіцыстыка журналістаў ужо даўно зрабіла беларускі бок вінаватым. Так, з лёгкай рукі тэлевізійных і газетных «кілераў», без усялякага следства «хітрыя беларусы» аказаліся адказнымі за тое, што «нажываюцца» на «эканамічнай вайне» паміж Расіяй і Захадам.

З прававога пункту гледжання вельмі цяжка каментаваць рашэнні Рассельгаснагляду, прынятыя на падставе «можа быць» і «існуе падазрэнне», але патрэбна адзначыць, што просьбу беларускага прадстаўніка ў Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргея Сідорскага не ўводзіць абмежаванні да атрымання вынікаў афіцыйнай праверкі расійскія партнёры не пачулі і пакінулі без увагі.

Падобна на тое, што тыя вынікі насамрэч нікога і не цікавяць, а сама кампанія была арганізавана з зусім іншымі мэтамі.

ГІСТОРЫЯ ПЫТАННЯ

Справа ў тым, што Расійская Федэрацыя, нягледзячы на амаль аптымальныя ўмовы для земляробства і жывёлагадоўлі, дагэтуль не можа паўнавартасна вырашыць задачы ўласнай харчовай бяспекі. Па вельмі пазітыўных афіцыйных звестках кіраўніка расійскага ўрада Дзмітрыя Мядзведзева, паказчык забяспечанасці па мясе і мясапрадуктах — каля 75%, а па малочных прадуктах — каля 60%. Калі браць асобную наменклатуру, то найбольш непрыемная сітуацыя склалася на рынку ялавічыны (каля 37%) і сыроў (53,2%).

У гэтых умовах, уцягваючыся ў эканамічнае супрацьстаянне з краінамі ЕС, чыя доля ў расійскім імпарце, напрыклад, сыроў і тварагу складала каля 62%, кіраўніцтва РФ мусіла парупіцца пра інтарэсы харчовай бяспекі і патрэбы звычайных спажыўцоў.

Вядома, адной з асноўных надзей Расіі ў плане забеспячэння прадуктамі харчавання была і застаецца Беларусь. Згодна са статыстыкай, таго ж сыру расійскі рынак спажывае каля 800 тыс. тон штогод, пры гэтым каля 400 тыс. тон складае імпарт, з іх каля 25% — прадукцыя беларускай вытворчасці. Пры гэтым, было адразу зразумела, што магчымасці айчынных прадпрыемстваў далёка не бязмежныя, таму афіцыйным Мінскам на ўзроўні ўрада яшчэ ў жніўні было ўзгоднена з Рассельгаснаглядам права на перапрацоўку замежнай сыравіны беларускімі вытворцамі. Вядома, такія дамоўленасці пэўным чынам паўплывалі на стратэгію знешнеэканамічнай дзейнасці шэрагу айчынных прадпрыемстваў. Скажам, толькі з палякамі былі падпісаны пратаколы аб намерах набываць да 200 тысяч тон малака штомесяц з мэтай далейшай перапрацоўкі для рэалізацыі на рынку Расіі.

КАМУ ВЫГАДНА?

Адразу ж пасля ўвядзення эканамічных санкцый у дачыненні да заходніх краін у матэрыялах расійскай прэсы пачалі мусіраваць тэму аб нейкай надзвычайнай выгадзе для эканомікі Беларусі падобнага становішча, а афіцыйныя асобы РФ сталі папярэджваць саюзнікаў аб недапушчальнасці рээкспарту замежных тавараў.

Выгада, безумоўна, ёсць, аднак маштабы прыбыткаў расійскім бокам яўна завышаюцца, гэтак жа як і спакуса арганізаваць шэрую схему хутчэй знаходзіцца бліжэй да расійскіх правілаў гаспадарання, чым да беларускіх. Напрыклад, згодна з інфармацыяй Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у верасні 2014 года экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі вырас усяго на 10,2% у параўнанні з вераснем 2013-га, што склала ў чыстым грашовым выражэнні каля 27 млн долараў.

Пасля дэвальвацыі расійскага рубля гэтыя «звышпрыбыткі» агулам стала цяжка падлічыць, а той жа Мінсельгасхарч Беларусі гаворыць ужо не пра выгаду, а пра страты беларускіх вытворцаў у выніку абясцэньвання расійскай валюты, што, згодна з падлікамі эканамістаў, дасягаюць 160 млн долараў.

Гэта значыць, тыя 10–15% росту беларускіх паставак наўрад ці дазваляюць заўважыць шалёны рост экспарту, які можа выклікаць «падазрэнні» Рассельгаснагляду. Атрымліваецца, што кажуць праўду эксперты, якія называюць сапраўднай мэтай «атакі» не ліквідацыю меркаваных схем рээкспарта, а спробу пэўных фінансавых колаў РФ узяць пад кантроль прадпрыемствы беларускай сельскай гаспадаркі.

Падобна на тое, што буйны расійскі бізнес сапраўды паверыў у магчымасць атрымліваць сур'ёзныя барышы, займаючыся рээкспартам з беларускіх пазіцый, а інструментам ціску, як ужо не раз бывала, выступіла дзяржаўная кантрольная ўстанова — гэтым разам Рассельгаснагляд.

ПА ЗАКОНЕ, А НЕ «ПА ПАНЯЦЦЯХ»

Цяпер паміж беларускім і расійскім бакамі ідуць інтэнсіўныя кансультацыі, па выніках якіх чакаецца, што пастаўкі беларускай прадукцыі, гэтак жа як і транзіт, адновяцца з 2 снежня 2014 года. Такі паварот да ранейшага «статус кво» яшчэ больш дадае няпэўнасці ва ўсю гэтую гісторыю і проста змушае шукаць «падводныя камяні».

У любым выпадку зразумела, што інтэграцыйныя структуры яшчэ занадта сырыя і мусяць быць умацаваны перад нацыянальнымі органамі, калі ў прыярытэце адносін будзе незалежнае следства згодна з нормамі права, а не палітычная воля аднаго з суб'ектаў улады краін — удзельніц Мытнага саюза.

Цалкам слушна ў гэтым ключы выглядае думка беларускага віцэ-прэм'ера Міхаіла Русага: «Каб кожны раз не даказваць расійскім партнёрам, што «я не лысы», у будучым ЕАЭС павінна быць прадугледжана наднацыянальная кантрольная служба, рашэнне якой і будзе вызначальным для суб'ектаў гаспадарання».

Аляксандр ШПАКОЎСКІ

■

■ Факт

ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ Ў СВЯТОЧНЫЯ ДНІ

Больш за 70 дадатковых цягнікоў міжрэгіянальных ліній будзе курсіраваць па Беларускай чыгунцы ў дні калядных і навагодніх свят.

У першую чаргу гэта датычыцца найбольш запатрабаваных напрамкаў: Мінск — Брэст — Мінск, Мінск — Гомель — Мінск і Мінск — Віцебск — Мінск. У святочны перыяд дадатковыя цягнікі таксама звяжуць паміж сабой Віцебск і Магілёў, Мінск і Полацк, Мінск і Пінск, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Паколькі максімальны пасажырапаток чакаецца 24–25 і 30–31 снежня, большасць прызначаных дадатковых цягнікоў будзе курсіраваць менавіта ў гэтыя дні. Акрамя таго, у саставы цягнікоў міжрэгіянальных ліній, што ўжо курсіруюць па вышэйназваных маршрутах, уключаюцца дадатковыя вагоны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫГУНАЧНІКІ ДАПАМАГЛІ ЗАТРЫМАЦЬ РЭЦЫДЫВІСТА

Злачынцы не грэбуюць зарабляць нават на бяспецы людзей. Сігнал аб тым, што на ўчастку дарогі Мірадзіна — Бабруйск знята некалькі тросаў ад дросельных перамычак, паступіў ад супрацоўнікаў станцыі Мірадзіна. Пільнасць праявілі начальнік станцыі Аляксандр Сойка разам са сваімі калегамі.

— Непрыветны малады чалавек трапіў мне на вочы якраз у той момант, калі я ехаў дадому на веласіпедзе ўздоўж чыгуначнай дарогі, — расказаў Аляксандр Сойка. — Я спытаўся, куды ён ідзе і чаму не хоча пачакаць электрычку. Але ён быў не вельмі гаваркім. І калі праз некалькі хвілін пазваніў дзяжурны і паведаміў аб здарэнні, я чамусьці адразу ж падумаў пра гэтага чалавека.

Пра яго чыгуначнікі аператыўна папярэдзілі супрацоўнікаў Бабруйскага АУС на транспарце. Ім аказаўся раней неаднаразова судзімы за падобныя злачынствы 31-гадовы жыхар Бабруйска.

За актыўную грамадзянскую пазіцыю і дапамогу органам унутраных спраў у раскрыцці злачынства Аляксандру Сойку аб'яўлена падзяка і ўручана грашовая прэмія.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАГОНЯ ЗА ЗДАРОЎЕМ

Самаму малому бегуну, які браў удзел у полацкім «народным марафоне», было ўсяго 3 гады, а старэйшаму 75!

— У Полацку прайшла акцыя «У пагоню за здароўем». Усім ахвотным на працягу гадзіны прапаноўвалася прабегчы дыстанцыю па сваіх магчымасцях. У выніку выпрабавалі свае сілы каля 110 чалавек. Цікава, што трохгадовы хлопчык Антон Брыгінец разам са сваёй маці пераадолеў дыстанцыю ў 2,5 кіламетра... А самыя паважанымі па ўзросце ўдзельнікамі спартыўнага мерапрыемства былі 75-гадовы Валерый Кіракоў і 68-гадовая Лідзія Макарэвіч, — паведамілі «Звяздзе» ў Полацкім райвыканкаме.

Увогуле палачане ў пагоні за здароўем прабеглі 510 кіламетраў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

КАНТАКТ
№ 4 (27)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»

■ Кампетэнтна

СЭКАНОМІЦЬ ЧАС МЫ ЗМОЖАМ РАЗАМ

Пошта ў сучасным свеце не толькі аператыўна адказвае на самыя розныя традыцыйныя запыты сваіх кліентаў, але і папярэджвае іх жаданні прапановай новых паслуг. Пра гэта і не толькі — размова з дырэктарам Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Галінай ЦЯРЭШЧАНКА.

— Нешта пастаянна змяняць і такім чынам удасканальвацца — проста неабходнасць сённяшняга часу, — лічыць кіраўнік. — Трэба пастаянна прапаноўваць новыя паслугі, укараняць іх, рабіць так, каб яны знаходзілі сваё дастойнае месца на рынку. Сёння мы замяшчаем звычайную перасылку пісьма на перасылку ў фармаце «першы клас». Згодна з міжнародным стандартам, перасылка ідзе па прынцыпе «дзень+адзін» у любы населены пункт рэспублікі, у той час як звычайным пісьмом гэта робіцца ў залежнасці ад пункта прызначэння па формуле «дзень+тры». Каштуе паслуга крыху даражэй, але ж пры гэтым значна памяншаюцца тэрміны яе выканання.

Посткросінг быў прыдуманы для тых, хто стаміўся ад стасункаў толькі ў інтэрнэце і аддае перавагу паштоўкам. Між іншым, наша рэспубліка актыўна ўключылася ў развіццё гэтага праекта і цяпер уваходзіць у топ-10 па аб'ёмах перасылак.

— Наколькі ведаю, сёння ўсе аддзяленні сувязі перабудавалі сістэму сваёй работы яшчэ і таму, што кліенты атрымліваюць шмат пасылак ад інтэрнэт-крам.

— Так, апошнія гады структура нашых паслуг у аддзяленнях сувязі мяняецца. Павялічваецца колькасць пасылак і дробных пакетаў. Адпаведна, мы прынялі рашэнне адкрываць пункты па іх выдачы. Выдзелены працоўныя месцы. У Гомелі працуюць пакуль 2 такія пункты. У пачатку снежня мы адкрываем яшчэ 2. А выдзеленых рабочых месцаў па прыёме і выдачы ў нас увогуле па вобласці 23, у тым ліку 10 у Гомелі.

— На пошту нярэдка прыходзяць людзі, якія кладуць, напрыклад, невялічкія грошы на тэлефон. Гэта часам моцна нервуе, бо значна зацягваецца час на абслугоўванне іншых кліентаў.

— Работа з дробнымі плацяжамі для нас таксама з'яўляецца праблемай. Проста павелічэннем колькасці працоўных месцаў ці павелічэннем працоўнага часу нашых аператараў яе не вырашыць. Прыйшоў час, калі мы павінны вучыць многіх нашых кліентаў карыстацца іншымі, альтэрнатыўнымі магчымасцямі для аплаты. Да слова, плацяжы за мабільныя тэлефоны ў структуры ўсіх нашых плацяжоў займаюць дастаткова вялікі працэнт. У той жа час працэдуру аплаты нескладана ажыццявіць праз іншыя плацежныя сістэмы. У тым ліку і непасрэдна на пошце праз інфакіёскі. Цяпер іх 135, і яны ўсталяваны ва ўсіх буйных аддзяленнях сувязі. Тую ж аперацыю нескладана зрабіць і праз карту экспрэс-аплаты — гэта вельмі хутка.

— Кліентаў трэба вучыць. Але ж, відаць, і супрацоўнікаў пошты — таксама...

— Вядома ж. Штомесяц мы збіраем для гэтага начальнікаў аддзяленняў сувязі. Вучым нават таму, якія словы павінен казаць аператар пры рабоце з кліентамі, гаворым пра тое, як спецыяліст павінен выглядаць на працоўным месцы.

— Галіна Анатольеўна, а вы самі чаму вучыцеся ад свайго персаналу?

— Некаторыя ўзнікшыя праблемы можа падказаць толькі аператар ці начальнік аддзялення. Таму часта атрымліваецца, што важныя ідэі ідуць ад іх. Потым мы рэалізуем пажаданні і атрымліваем хуткі эфект.

Часта пры асабістым кантакце супрацоўнікі пошты як у гарадскіх, так і ў сельскіх аддзяленнях сувязі нешта важнае прапаноўваюць. Бывае, разам садзімся і пачынаем вывучаць праграмны прадукт: што проста, што складана, што трэба ўдасканаліць.

— А як прыжываюцца, як працуюць перасоўныя аддзяленні сувязі?

— На Гомельшчыне іх 53, і праца іх у многім залежыць ад асобы супрацоўніка. У снежні ў Рэчыцы і Мазыры мы праводзім два семінары для начальнікаў перасоўных аддзяленняў сувязі. Для таго, каб павысіць якасць паслуг, будзем яшчэ больш увагі надаваць абмену вопытам, павышэнню прафесіяналізму.

— А як з пашырэннем сеткі паштовых аб'ектаў у гарадах?

— Мы пастаянна працуем у гэтым кірунку. Сёлета ў 19 мікрараёне Гомеля пабудавалі новае буйное аддзяленне сувязі, адкрыццё якога плануем на 6 снежня. У гэтым аддзяленні кліентаў будуць абслугоўваць на трох рабочых месцах і ў пункце выдачы паштовых адпраўленняў. Загадзя запрашаем!

— У наша жыццё актыўна ўваходзіць тэма электроннага ўрада. У якой якасці тут прадстаўлена пошта?

— Мы рэалізуем гэтую паслугу праз агульнадзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму. Для гэтай мэты ў нас пакуль што ў трох аддзяленнях сувязі Гомеля ўсталяваны камп'ютары, якія выдаюць даведкі. А з 1 студзеня 2015 года такія паслугі можна будзе заказаць і ў кожным раённым вузле паштовай сувязі. Цяпер кліент можа атрымаць інфармацыю па трох кірунках. Напрыклад, запытаць інфармацыю па сваіх запазычанасцях у бюджэт: крэдытах, камунальных плацяжах... Па-другое, чалавек можа даведацца пра нейкі аб'ект маёмасці, калі, напрыклад, ён хоча яго набыць: маючы адрас, можна даведацца, хто гаспадар дома, якая плошча яго, які год будаўніцтва... Гэтая ды іншая інфармацыя можа дапамагчы чалавеку разабрацца ў розных жыццёвых сітуацыях. І трэцяя паслуга — даведкі юрыдычнай асобе пра яе запазычанасць у бюджэт. Дзякуючы такой інфармацыі людзі змогуць вырашыць многія далікатныя праблемы. На жаль, пакуль што можам прапанаваць у гэтым кірунку толькі 3 паслугі, але па меры гатоўнасці ўладальнікаў інфармацыі будзем пашыраць іх спектр...

— Гомельшчына, як і іншыя вобласці краіны, актыўна ўключылася ў посткросінг — міжнародны анлайн-праект, мэтай якога з'яўляецца абмен паштовымі карткамі і маркамі паміж людзьмі з розных куткоў планеты.

— Посткросінг быў прыдуманы для тых, хто стаміўся ад стасункаў толькі ў інтэрнэце і аддае перавагу паштоўкам. Між іншым, наша рэспубліка актыўна ўключылася ў развіццё гэтага праекта і цяпер уваходзіць у топ-10 па аб'ёмах перасылак. Інтарэс да посткросінгу вялікі. Праз паштоўкі людзі могуць расказваць пра сваю краіну, дзяліцца пачуццямі і жартамі, расказваць пра свае захапленні. На паштоўках — не толькі віды нашай прыгожай прыроды, але і фотаздымкі з рэцэптамі беларускай кухні, абрады Беларусі, віды марак краіны, карціны Нацыянальнага мастацкага музея... Тыя, хто зацікавіўся гэтай справай, гавораць, што адарвацца ўжо нельга. У нас на Гомельшчыне ёсць некалькі сотняў пастаянных аматараў посткросінгу, якія вядуць актыўную перапіску з усім светам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■ На сувязі

ТОЛЬКІ ПОШТА. І НІЧОГА ЛІШНЯГА

Адправіць ці атрымаць пасылку цяпер можна хутчэй

Прыкмета часу: грошы на вецер можа кідаць толькі той, хто грабе іх лапатай. Усе астатнія стараюцца з розумам траціць. Напэўна, таму ў нашай краіне ўжо дзейнічае больш за 10 тысяч інтэрнэт-крам, з якімі супрацоўнічае РУП «Белпошта». А ў выніку... Мая прыяцелька, напрыклад, ужо не першы год на інтэрнэт-сайтах і ў каталогах (у тым ліку айчынных вытворцаў) знаходзіць нешта адметнае для сваёй сям'і, для сяброў, потым, не выходзячы з дому, замаўляе і чакае пасылак.

Калі яны прыходзяць, вядома ж, не церпіцца хутчэй забегчы ў аддзяленне паштовай сувязі, атрымаць, распакаваць, агледзець абноўкі.

ЗНАЙСЦІ ПАКЕТ ДАПАМОЖА СКАНЕР

Зрэшты, многім, скажам так, «дыстанцыйным» пакупнікам, выпрабоўваць сваю цікаўнасць такім чынам ужо не даводзіцца: атрымліваць і адпраўляць пасылкі цяпер можна хутчэй дзякуючы спецыяльным пунктам, якія паступова з'яўляюцца як у нашай сталіцы, так і ў іншых абласных гарадах.

Гэтыя ўстановы выглядаюць як звычайныя аддзяленні паштовай сувязі. Ды, па сутнасці, гэта тая самая пошта ў класічным разуменні.

Выдачай паштовых адпраўленняў занята аператар Вікторыя Чарнак.

У прыватнасці, у невялікае памяшканне на сталічнай вуліцы Русіянава, 36, куды завіталі журналісты «Звязды», сцякаюцца пасылкі і карэспандэнцыя для жыхароў усяго мікрараёна Уручча.

Уздоўж сцен — стэлажы, на іх — пакеты розных памераў і колераў. Працуюць тры касы: дзве — для выдачы адпраўленняў і адна — для прыёму. Штохвілінна пікае сканер: рабочыя месцы спецыялістаў абсталяваны самымі сучаснымі тэхнічнымі і праграмнымі сродкамі. А таму абслугоўванне кліентаў ідзе спакойна і вельмі хутка: самая вялікая чарга, якую мы ўбачылі, сабрала шэсць чалавек і знікла на працягу дзесяці хвілін. Гэта, мабыць, самае прыемнае: для таго, каб атрымаць пасылку, цяпер не трэба стаяць у чарзе з ахвотных аплаціць камунальныя паслугі, мабільную сувязь, аўтамабільную страхоўку ці аматараў проста папрасіць у аператара: «Пакажыце ву-у-унь тую паштовачку... І яшчэ тую. І вось гэтую. А што ў вас ёсць яшчэ?..»

Як расказала **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях РУП «Белпошта» Таццяна ГВОЗДЗЕВА**, у Мінску адкрыты ўжо тры спецыялізаваныя пункты па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў, дзе любую карэспандэнцыю — хуткая пошта EMS, лісты, пасылкі, грашовыя пераводы — можна атрымаць ці адправіць за лічаныя хвіліны. Для зручнасці кліентаў пункты працуюць у будныя дні з 8.00 да 22.00, а ў выхадныя — з 9.00 да 20.00.

Прамень сканера беспамылкова знаходзіць штрых-код на бланках паштовых паведамленняў.

Асабліва адчувальная праца такіх вось пунктаў у перыяд аплаты камунальных паслуг, атрымання пенсій ды і проста ў вячэрні час, калі ў большасці працуючых з'яўляецца магчымасць зайсці на пошту.

— У тых аддзяленнях сувязі, адкуль мы, так бы мовіць, забралі адну з паслуг (па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў) зніжаецца нагрузка на аператараў, абслугоўванне кліентаў па іншых аперацыях ідзе хутчэй... У той жа час і тут ніякіх чэргаў няма, — распавядае **намеснік начальніка вытворчасці «Мінская пошта» па эксплуатацыі Алена ПРАКАПЕНЯ**.

Як атрымаць сваю пасылку ў спецыяльна вылучаным пункце? Гэтаксама, як і на звычайнай пошце. Спачатку, дачакаўшыся паведамлення аб тым, што пасылка ці бандэроль прыйшла, трэба звярнуць увагу на адрас пункта, дзе можна іх атрымаць. Потым, звярнуўшыся па сваё адпраўленне, перадаць аператару запоўнены квіток і ўласны пашпарт. Пры дапамозе спецыяльнага сканера аператар вызначае, на якім стэлажы і ў якім месцы ляжыць патрэбнае, забірае яго, пры неабходнасці прымае аплату за пакет і выдае кліенту.

— Пакуль што ў Мінску пункты па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў працуюць на вуліцах Адзінцова, Куйбышава і Русіянава. Але мы разлічваем адкрыць іх у кожным адміністрацыйным раёне, — дзеліцца планамі Алена Пракапеня. — А ўжо канкрэтная колькасць іх будзе залежаць ад аб'ёмаў. Калі, напрыклад, у Цэнтральным раёне дастаткова аднаго такога пункта, то ў Фрунзенскім, які актыўна разрастаецца, іх трэба адкрываць некалькі.

ЯКАСЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

У вышэйзгаданым пункце па вуліцы Русіянава людзей, якія хацелі б атрымаць ці адправіць карэспандэнцыю, мы заспелі няшмат. Магчыма, таму, што яны заходзілі і амаль адразу ж сыходзілі, трацячы на атрыманне паслугі адну-дзве хвіліны — не больш. У прыватнасці, у мужчыны сярэдніх гадоў мы пацікавіліся, ці даспадобы яму змены ў абслугоўванні.

У Мінску працуюць ужо тры пункты па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў, дзе за лічаныя хвіліны можна атрымаць ці адправіць любую карэспандэнцыю.

— Мне трэба было адправіць некалькі лістоў. Я зрабіў гэта вельмі хутка, без ніякай чаргі, — прызнаўся ён.

Па пасылку завітала ў пункт і Наталля — маладая матуля з сынам.

— Я прыходжу сюды ўжо трэці раз. Атрымліваю, у асноўным, цацкі, нейкія рэчы для дзіцяці, ну і для сябе што-небудзь... Рада, што гэты пункт адкрыўся, бо абслугоўваюць вельмі ветліва, хутка...

Кажуць, у вячэрні час, калі наплыў кліентаў узрастае, сітуацыя крыху мяняецца. Але ж, па словах Алены Пракапені, ніякіх вялікіх чэргаў не ўзнікае і тады: аператары без цяжкасцяў выконваюць сваю працу.

Як прызнаюцца спецыялісты, павышэнне якасці абслугоўвання кліентаў, стварэнне камфортных умоў пры атрыманні паштовых адпраўленняў стала мэтай адкрыцця падобных пунктаў. Тут, на вуліцы Русіянава, штодзённа выдаюць па некалькі соцень пакетаў. Аб'ём выходнай карэспандэнцыі пакуль што намнога меншы, аднак колькасць аперацый — як па выдачы, так і па адпраўцы — расце літаральна не па днях...

Падобныя ўстановы працуюць не толькі ў нас, але і ў іншых краінах. Разам з тым, на нашых пунктах пасылкі і любую іншую карэспандэнцыю можна не толькі атрымаць, але і адправіць. Што, пагадзіцеся, асабліва актуальна цяпер, напярэдадні калядных і навагодніх свят.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

Аператару Але Юртаевай на пошук пасылкі патрэбна адна хвіліна.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Філатэліст

З эмблемай РСС

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 20 лістапада выпусціла ў абарачэнне новую паштовую марку «Зімовыя віды спорту. Біятлон» з эмблемай РСС — Рэгіянальнага супрацоўніцтва ў галіне сувязі.

Пагадненне па арганізацыі выпуску дзяржаўных знакаў паштовай аплаты і філатэлістычнай прадукцыі па тэматыцы і з наяўнасцю ў малюнку эмблемы РСС было заключана ў 2011 годзе. Першы выпуск у Беларусі быў адзначаны маркай «20-годдзе ўтварэння РСС», другі — дзвюма маркамі з серыі «Беларускае народнае адзенне», трэці — маркай «Гісторыя нацыянальнай сувязі». Выпуск маркі «Зімовыя віды спорту. Біятлон» працягвае серыю.

У дзень выпуску ў сталічным аддзяленні сувязі №1 (крама Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

■ Ёсць пытанне

ЛІСТ, ЯКІ ДАЛЯЦІЦЬ ТЭЛЕГРАМАЙ...

Я, можна сказаць, чалавек старой фармацыі: карыстаюся мабільнай сувяззю, але ўсё ж, калі некага з блізкіх трэба падтрымаць у горы альбо павіншаваць са святам, іду на пошту, купляю канверты, паштоўкі, адпраўляю лісты альбо тэлеграмы на адпаведных бланках. Вось і нядаўна хацела павіншаваць з юбілеем сваю сяброўку. Аднак мне сказалі, што для гэтага трэба альбо адпраўляць нейкі зусім незразумелы ліст, альбо тэлефанаваць у Барысаў... Другое, як мне падалося, будзе прасцей, але...

Не адразу, на жаль, пашчасціла дазваніцца. Час пайшоў і на тое, каб перадаць свой тэкст (аператар прызналася, што не ведае беларускай мовы)... А пасля гэтага ў мяне з'явілася пытанне: куды зніклі прывычныя тэлеграмы, няўжо яны сталі непатрэбнымі?

Н. МАЦВЕЕВА,
Бярэзінскі раён

— Найперш хацелася б патлумачыць нашым шаноўным кліентам (у тым ліку і «старой фармацыі»), што тэлеграмы нікуды не зніклі. Яны па-ранейшаму прымаюцца ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі, у тым ліку і нашага Мінскага філіяла РУП «Белпошта». Праўда, называюцца трохі інакш — netліст, — патлумачыла **намеснік дырэктара філіяла Алена ІШЧУК.** — Netліст — гэта тое ж паведамленне на папяровым носьбіце або ў электроннай форме, якое затым апрацоўваецца з выкарыстаннем электронных сродкаў сувязі, трансфармуецца ў адпраўленне пісьмовай карэспандэнцыі і ўручаецца атрымальніку.

Аператары паштовай сувязі, да якіх звяртаюцца кліенты, вядома ж, могуць пракансультаваць ахвотных адправіць тэлеграмы-netлісты па ўсіх пытаннях, дапамагчы правільна адрасаваць — у любыя населеныя пункты нашай краіны. У прыватнасці, адпраўленне netліста катэгорыі «1 класа» ажыццяўляецца на працягу 30 хвілін, катэгорыі «звычайнае» — на працягу 1 гадзіны.

З мастацкімі паштоўкамі праблем таксама ўзнікаць не павінна: тэматыка іх досыць шырокая, выбар — па жаданні адпраўшчыка, па змесце адпраўлення...

За 10 месяцаў гэтага года работнікі аддзяленняў паштовай сувязі нашай вобласці прынялі амаль 3 тысячы netлістоў.

Разам з імі, netлістамі, прымаюцца і тэлеграмы — у асноўным за межы нашай рэспублікі. Перадача іх — пасля адпаведнай аплаты — ажыццяўляецца з тэлефонаў аддзяленняў сувязі. Калі кліент перадае тэлеграму з іншага нумара тэлефона, плата ўключаецца ў тэлефонны рахунак.

Тэлеграмы, прынятыя ад фізічных і юрыдычных асоб у аддзяленнях паштовай сувязі Мінскай вобласці з 10 чэрвеня гэтага года сапраўды перадаюцца праз абласную службу 166 «Прыём паведамленняў па тэлефоне» РУП «Белтэлекам», якая знаходзіцца ў Барысаве.

Так што выбар сапраўды за кліентамі.

ЗА КРОК АД ДОМА

Новы павільён «Белсаюздрука» адкрыўся на вуліцы Шаранговіча ў Мінску

Гандлёвая сетка прадпрыемства актыўна развіваецца. «Белсаюздрук» не толькі павялічвае колькасць павільёнаў, але і мяняе якасць абслугоўвання. Традыцыйныя кіёскі паступова ўступаюць пазіцыю сваім новым, больш зручным «братам». Так новыя гандлёвыя пункты «Белсаюздрука» маюць выгляд невялічкіх крам, дзе наведвальнікі могуць не толькі купіць свежую прэсу па даросце на працу, але і ўзбадзёрыцца кубачкам кавы.

— Мы прапануем тавар у вольным доступе з пашыраным асартыментам, — распавядае намеснік дырэктара «Белсаюздрука» Аксана Валгай. — Даступнасць, новы рэжым працы без выхадных — гэта ўсё несумненныя плюсы. Вялікую ўвагу надаём беларускім выдавецтвам. У Фрунзенскім раёне такі павільён новага тыпу ўжо другі. Спальны раён абраны невыпадкова. Арыентуемся на сем'і, маладых мам, якім у нас будзе зручна набыць патрэбную літаратуру.

Ганаровае права перарэзаць чырвоную стужку было прадастаўлена першаму намесніку кіраўніка Фрунзенскага раёна Сяргею Жалязняку.

Надзея БУЖАН,
фота аўтара.

■ Даты

ВЫПУСКНІКАМ... НА ДОБРЫ УСПАМІН

Сто гадоў таму, 21 лістапада 1914 года, у Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё настаўніцкага інстытута.

Цяпер гэта Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, найбуйнейшы навукова-метадычны і вучэбны цэнтр у галіне педагагічнай адукацыі, вядучая ВНУ краіны па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных педагогаў, якія здольны вырашаць прафесійныя задачы, валодаюць перадавымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

За стагоддзе ў гэтай ВНУ падрыхтавана больш за 170 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў. Сярод іх — вядомыя вучоныя, заслужаныя настаўнікі, кіраўнікі школ, факультэтаў і кафедраў, Героі Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, члены Саюза пісьменнікаў...

Да стагоддзя навучальнай установы РУП «Белпошта» выпусціла ў абарачэнне мастацкі маркіраваны канверт. На ўрачыстай цырымоніі яго гашэння прысутнічалі рэктар БДПУ, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр Жук, першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена Скрыпчык, начальнік выдавецкага цэнтра «Марка» Ірына Шыпілава і інш.

■ Падпіска-2015

Звяздоўскія прызы — лепшым паштальёнам

І арганізатарам падпіскі

Што праўда, тое праўда: дрэнны не толькі той салдат, які не марыць стаць генералам, але і выдавец, які не хацеў бы павялічыць колькасць сваіх чытачоў.
У мэтах захавання падпісных тыражоў рэдакцыя газеты «Звязда» заснавала два конкурсы — для самых руплівых паштальёнаў і лепшых арганізатараў падпіскі.

Што трэба, каб у іх перамагчы? Вядома ж, захаваць і нават павялічыць колькасць нашых чытачоў-падпісчыкаў. Прычым для паштальёнаў на 1.01.2015 года ў параўнанні з 1.01.2014 года яна павінна павялічыцца не менш як на 10 чалавек. Гэта не так і проста? Сапраўды... Але ж затое потым застануцца дробязі, прычым прыемныя: кіраўнікі аддзяленняў сувязі і РУПСаў не пазней чым да 25 студзеня новага года звесткі аб поспехах лепшых паштальёнаў накіруюць у РУП «Белпошта». І ўжо там спецыяльная камісія, у склад якой уваходзяць і супрацоўнікі рэдакцыі, вызначыць самага лепшага паштальёна — па адным у кожнай вобласці і горадзе Мінску.

У якасці прызоў кожны з рупліўцаў атрымае па 5 млн рублёў.

Не застаюцца без увагі і арганізатары падпіскі: у якасці прыза ад рэдакцыі «Звязды» па 2 млн рублёў атрымае кожны з начальнікаў раённых вузлоў паштовай сувязі ў выпадку аднаўлення тыражу па раёне на 100%. Пры павелічэнні тыражу прадугледжаны дадатковыя надбаўкі.

Ёсць сэнс старацца? Тады поспехаў!

ПЕРАВАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА

Тэатральны «Бусел» пасецца на сцэнічных палетках з айчыннай глебай

«Няма таго, што раньш было»: Нацыянальная тэатральная прэмія сёлета змяніла фармат. Але як ад гэтага зменіцца наш тэатр? Вось пытанне, якое задавалі сабе зацятыя тэатральныя гледачы, што сочаць за новымі пастаноўкамі і хочуць разумець, дзе той узровень, калі сапраўды можна сказаць «гэта лепшы спектакль». Цяпер не вызначаюць бясспрэчна лепшую пастаноўку Беларусі, як у папярэднія гады. Затое, прэмій шмат — роўненька па намінацыях.

Але відавочная адна цікавая рыса: бадай ва ўсіх намінацыях «лепшымі спектаклямі» названы тыя, што ўзялі за аснову творы айчынных аўтараў. Прычым, калі раней такія былі ў драматычным тэатры, то цяпер і ў музычным, і нават у балеце яны адзначаны. Не важна, што, можа быць, альтэрнатывы не было. Затое ёсць прэмія.

Вось, напрыклад, балет Вячаслава Кузняцова ў пастаноўцы Юрыя Траяна «Князь Вітаўт», прадстаўлены Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам. Беларуская гістарычная аснова, беларуская музыка, пастаноўшчыкі, трупа. І Нацыянальная тэатральная прэмія — «за лепшы балетны спектакль». Можна было б сказаць, што спрачацца за прэмію ў гэтай намінацыі не было з кім. Але тут жа адказ скептыкам ад журы: гэта яшчэ і «Лепшая сучасная беларуская пастаноўка». Хто хоча зразумець, чаму, няхай паспрабуе вывесці сваю формулу лепшага сучаснага айчыннага спектакля, азнаёміўшыся з тымі пастаноўкамі, у якіх адборачная камісія ўбачыла патэнцыйных прэтэндэнтаў на прэмію. Варыянты ёсць — у кожнага можа быць свой. Але выбіраць насамрэч ёсць з чаго. Усяго сёлета ў рамках Нацыянальнай тэатральнай прэміі быў прадстаўлены 21 спектакль.

Але цяпер мы будзем глядзець як «Лепшы музычны спектакль» «Соф'ю Гальшанскую» Уладзіміра Кандрусевіча (у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры). Зноў-такі дзяржаве патрэбен быў мюзікл па духу наш, родны — і ён ёсць. І на яго звернута ўвага: сам факт яго існавання — гэта вялікі прарыў для беларускага тэатра.

Людзі, якія любяць тэатр, насамрэч вельмі чакаюць гэтых прарываў — у плане якасці. Ці не дзеля гэтага калісьці і заснавалі Нацыянальную тэатральную прэмію? Журы было вельмі шырокім, што тады давала спадзяванні на аб'ектыўнасць у вызначэнні лепшых. Цяпер за кожную намінацыю адказвае пэўны склад журы — іншая сістэма. Таму цяпер, калі гавораць пра пастаноўку «лепшая», то ўзнікае жаданне зразумець: для каго? У журы як і раней — крытыкі, эксперты, прадстаўнікі тэатраў. Толькі ў абмежаванай колькасці. Зразумела, што цяпер па некалькі «Буслоў» здабыць нерэальна за адну прэмію, як гэта было раней, калі ўсе члены вельмі шырокага журы павінны былі паглядзець усё.

«Лепшым спектаклем тэатра драмы» вызначылі пастаноўку паводле Андрэя Макаёнка «Аракул?..» (рэжысёр Барыс Луцэнка) Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага. Хоць у гэтай катэгорыі прэтэндэнтаў было найбольш, і нават з беларускай тэмай і драматургічнай асновай.

І ў тэатры лялек верх узяло сваё: сярод экстравагантнага «Гамлета» з Магілёва і «Фауста...» з Гродна перавагу атрымаў Уладзімір Караткевіч з «Ладдзёй роспачы» ад Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, а яго стваральнік Аляксей Ляляўскі адзначаны яшчэ і як рэжысёр. Не было нацыянальнай афарбоўкі хіба што ў пераможцаў па дзвюх катэгорыях. «Лепшы спектакль для дзяцей» — «Снежная каралева» (паводле Х.К Андэрсэна) створаны ў Драматычным тэатры Беларускай арміі. Але варта яшчэ «Малога і Карлсана» (паводле А.Ліндгрэн) наведаць з дзецьмі ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек і «Шматочкі па закуточках» (Р. Остэр) у Мінскім абласным тэатры лялек «Батлейка» — у іх адзначана праца рэжысёра Аляксандра Янушкевіча як рэжысёра, які стварыў лепшыя пастаноўкі для дзяцей.

Фота БЕЛТА.

Узнагароду «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва» атрымала народная артыстка Беларусі Наталля ГАЙДА.

Ну, і опера. Яна ёсць, толькі замежная. Лепшы оперны спектакль ў Нацыянальным Вялікім тэатры — «Лятучы галандзец» Рыхарда Вагнера ў пастаноўцы Ханса-Ёахіма Фрая.

Такім чынам, сёлета больш лепшых. Больш тэатраў, якія могуць святкаваць свой трыумф на Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Больш артыстаў, якія атрымалі «Буслоў» за працу ў розных тэатральных пастаноўках у залежнасці ад намінацый — яны таго вартыя ўжо таму, што выходзяць на сцэну дзеля нас, і робяць гэта шчыра. У тэатры шмат герояў, шмат людзей, без якіх не будзе гэтага мастацтва — драматургі, рэжысёры, кампазітары, мастакі (лепшым сёлета прызнаны Валерый Раеўскі, якога ўжо няма сярод нас). Але тое, што мы бачым, і тое, як успрымаем тэатр, залежыць ад выканаўцаў.

Лепшыя адзначаны самім жыццём, якое прайшло ў тэатры. Наталля Гайда. Гэта імя, асоба, увасабленне любові. Цяпер яна яшчэ атрымала ўзнагароду «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва». Але ці не самай арыгінальнай адзнакай яе творчых заслуг стала магчымасць выехаць на сцэну ў рарытэтным аўтамабілі «Шэўрале» 1937 года, які належаў самому Янку Купалу, аднаму з тых, хто сваімі творамі прычыніўся да стварэння прафесійнага беларускага тэатра. Гэтым усё сказана.

А што не сказана — кожны зразумее сам, калі пазнаёміцца з тымі, хто быў намінаваны сёлета. Як і сам знойдзе свой лепшы спектакль. Такім чынам наш тэатральны «Бусел» сваімі крыламі толькі прыадхінуў заслону.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Шпацыр па Камароўцы

КЛУБНІЦЫ ПА КОШЦЕ ПАЛЯНДВІЦЫ

А бананы — па цане сала

Пачынаем з мясных радоў. Ялавічыну (кумпяк) можна знайсці па цане ад 120 да 140 тысяч рублёў за кілаграм. А вось сыравэнджаны далікатэс амаль у два разы даражэйшы — 230 тысяч. Бройлернае кураня «важыць» пад 30 тысяч за кілаграм, хаця кошт можа быць і ў два разы большы. Грудка індычкі ёсць па 95 тысяч за кілаграм. Кіло цяляціны, дарэчы, прапануецца па тым жа кошце.

Паляндвіцу на рынку лепш шукаць пільна: цэны самыя розныя. Напрыклад, кілаграмовы кавалак за 90 тысяч выглядае не зусім спакушальна, у адрозненне ад «хатняй» за 239 тысяч. Але цалкам магчыма знайсці «залатую сярэдзіну» за 170 тысяч рублёў.

Бюджэтны варыянт для мяснога меню — фарш для катлет, які складаецца напалову з ялавічыны, напалову са свініны — за кілаграм просяць 58 тысяч. Па кошце ў 70 тысяч рублёў за кілаграм прапануецца «доктарская» каўбаса.

У адным месцы за кілаграм салёнага хатняга, прыпраўленага часнаком, сала просяць 85 тысяч рублёў. На наступнай кропцы той жа прысмак, толькі з пазнакай «па-сялянску», каштуе даражэй на 25 тысяч.

Актыўна прадаецца хатні сыр. Тут ёсць з чаго выбраць: у наяўнасці папулярныя брынза і сулугуні. Кілаграм смакаты ў абодвух выпадках каштуе прыстойна — 220 тысяч рублёў. Прадаўшчыца адзначае, што ў кілаграме сыру — ажно 5 слоікаў малака! У выхадныя яго разбіраюць і за 250 тысяч за кілаграм.

Прылаўкі завалены хурмой — як маленькай, так і вялікай. Кілаграм «шакаладнага каралька» лёгка знайсці ў сярэднім за 25 тысяч рублёў. А вось з гатункам «какі» сітуацыя крыху іншая: ёсць як па 22, так і па 50 тыс. Чаму такое адрозненне? Калі прыглядзецца, то даражэйшая хурма ў два разы большая па памеры. Але ці ўдвая смачнейшая? Усё ж, вядучую пазіцыю хурма пакідае мандарынам. Дарэчы, набыць кілаграм гэтых фруктаў можна як за 18, так і за 40 тысяч, хаця на выгляд яны не вельмі адрозніваюцца. Па такім жа кошце можна знайсці грэйпфруты. Авакада прадаюць паштучна — 35 тысяч рублёў за адзін плод (за гэтую ж суму можна купіць ананас). Лімоны і апельсіны ёсць і за 20, і за 25 тысяч. А яшчэ на прылаўках ізноў з'явіліся невялічкія «бэбі-бананы». З лета іх кошт, дарэчы, не змяніўся — 100 тысяч за кілаграм. Нядорага можна паласавацца малдаўскім вінаградам, сярэдні кошт якога — 14 тысяч рублёў за кілаграм.

Стаграмовыя вітамінныя пучкі базіліку і рукалы аддавалі па 30 тысяч, кінзу — за 15, салату за 20 тысяч рублёў. А звыклыя кроп і пятрушка каштуюць, як і раней, — 8 тысяч. На прылаўках прыкметна пабольшала хатніх саленняў і квашаных прысмакаў. Знайшліся цудоўныя мочаныя яблыкі — 20 тысяч рублёў за кілаграм. Хрумсткая капуста спакушае выкласці за яе 30 тысяч, капуста па-карэйску аблегчыць кашалёк на 40 тысяч рублёў за кіло. Мочаны часнок ідзе па адным кошце з салёнымі груздамі — 15 тысяч. І хаця ўжо выпаў снег, усё яшчэ прадаюць журавіны і каліну — адпаведна, за 50 і 15 тысяч рублёў за літровы слоік.

Крыху павялічыліся цэны на беларускую агародніну: кілаграм морквы, буракоў альбо цыбулі ўжо «важыць» 10 тысяч рублёў. Свежая капуста разыходзіцца па 7 тысяч за кілаграм, а брусельская — за 25 тысяч. Прапануюць кіло свежых агуркоў за 45 тысяч, але можна знайсці і па 23 тысячы. А што датычыцца памідораў — выбару не так шмат, ёсць не надта прывабныя «мясістыя» беларускія за 20 тысяч, і больш сімпатычныя, чырвоныя малдаўскія — «усяго» 30 тысяч за кілаграм. Невялічкія «чэры», нягледзячы на памер, каштуюць 50 альбо 75 тысяч за ўпакоўку.

Цэны на айчынныя яблыкі практычна не змяніліся: «Ліголь», «Ананасныя», «Каштэль», «Малінавае» ў сярэднім можна набыць за 12 тысяч рублёў за кілаграм. Можна пакаштаваць і ў сушаным выглядзе — пакунак прадаецца за 15 тысяч. Паўлітровы слоік сушанай бэры, падобнай да дзічкі, аддаюць за 25 тысяч.

Дарэчы, для тых, хто хоча ўзгадаць смак лета і паласавацца клубніцамі, камароўскія прадаўцы таксама прапанавалі свой варыянт — кілаграм ягады за 170 тысяч рублёў — па адным кошце з паляндвіцай.

Кацярына РАДЗЮК

Авалодаць словам і сучаснымі тэхналогіямі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ці нармальна, што журналістыка, мяркуючы па студэнтах, становіцца «дзявочай» прафесіяй?

— Думаю, што плённа працаваць у журналістыцы могуць і дзяўчаты. Наўрад ці якасць матэрыялаў і саміх сродкаў інфармацыі залежыць ад таго, больш там жанчын ці мужчын. Хаця быў час, калі ў журналістыку ішлі ў асноўным хлопцы. Напрыклад, сярэдзіна 60-х — пачатак 70-х гадоў. Тады нагул на факультэт прымалі зусім мала людзей, чалавек 25.

— Што істотна змянілася ў апошні час на факультэце і ў прафесіі?

— З 2008 года журфак пераехаў у новае памяшканне і атрымаў другое дыханне. Ёсць цудоўныя матэрыяльныя магчымасці для арганізацыі навучальнага працэсу: добрыя аўдыторыі, лабараторыі, камп'ютарныя класы, тэлестудыя. Адкрыліся новыя спецыяльнасці, што значна пашырыла кола спецыялістаў, якія пойдуць працаваць у сродкі масавай інфармацыі. Мы ўлічваем запатрабаванні рэдакцый. Раней здаралася так, што чалавек пасля ўніверсітэта прыходзіў у газету ці на радыё і яму яшчэ быў патрэбен год, каб упісацца ў калектыў, працаваць на патрэбным узроўні. Сёння нашы выпускнікі адразу ўключаюцца ў творчы працэс. Трэцяя частка студэнтаў ужо замацаваліся за сродкамі інфармацыі. Мы садзейнічаем таму, каб яны на 2 — 3-м курсе маглі працаваць на чвэрць ці палову стаўкі. Ніводзін рэдактар не будзе браць у штат журналіста, якога ён не ведае. Таму, каб размеркавацца ў пэўнае выданне, выпускнік павінен спачатку папрацаваць там пазаштатным карэспандэнтам. Сама прафесія стала больш дынамічнай, патрабуе ад журналістаў шмат ведаў, тэхнічнай падрыхтоўкі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Праграмы навучання ў інстытуце адаптаваныя да патрабаванняў сучаснай медыйнай сістэмы.

— Сёння інфармацыйныя тэхналогіі развіваюцца вельмі хутка. Ці паспявае адукацыя за імі?

— Мы адаптуем праграмы навучання пад выклікі сучаснай медыйнай сістэмы. Некалькі гадоў таму адкрылі такія напрамкі, як вэб-журналістыка, менеджмент СМІ. З'явіліся новыя дысцыпліны, якія ўлічваюць асаблівасці інфармацыйнай прасторы. Напрыклад, «Медыяэкалогія», «Асновы інтэрнэт-журналістыкі».

— Некалькі слоў пра перайманне міжнароднага вопыту. З якімі краінамі супрацоўнічае факультэт?

— Ёсць дагаворы аб міжнародным супрацоўніцтве з Украінай, Швецыяй, Германіяй, Славакіяй, Балгарыяй. На факультэце вучацца студэнты з Кітая (каля ста чалавек), японцы, жыхары Расіі і Прыбалтыкі. Маем добрыя стасункі са шведскім Інстытутам павышэння кваліфікацыі журналістаў FOJO. Групы нашых студэнтаў штогод ездзяць па абмене на практыку ў Швецыю, спрабуюць сябе ў мясцовых газетах і на радыёстанцыях. Некалькі дзён назад мы падпісалі дагавор з Вольным інстытутам Германіі. Плануем, што беларускія студэнты і выкладчыкі будуць стажыравацца там, а іх лектары чытаць у нас. З Кітаем супрацоўнічаем ужо 15 гадоў. За гэты час каля дзвюх тысяч кітайцаў скончылі наш факультэт. Многія з іх вучыліся ў магістратуры і аспірантуры. Цяпер у Хэнаньскім універсітэце працуюць два нашы выкладчыкі. У перспектыве групы кітайскіх студэнтаў пасля двух курсаў будуць давучвацца ў нас, а беларусы — завяршаць адукацыю ў Хэнані. І атрымліваць двайныя дыпломы. Дарэчы, на міжнародную канферэнцыю, прысвечаную 70-годдзю факультэта, мы чакаем каля 30 выкладчыкаў з розных краін.

— Выпускнікі журфака знаходзяць сябе ў прафесіі?

— Пераважная колькасць выпускнікоў адбыліся як журналісты. Некаторыя сталі пісьменнікамі (Адам Мальдзіс, Іван Чыгрынаў), паэтамі (Васіль Зуёнак, Генадзь Бураўкін), кінарэжысёрамі (Анатоль Алай, Віктар Дашук). У нас ёсць такое званне, як ганаровы прафесар Інстытута журналістыкі. Мы прысвойваем яго нашым выпускнікам, якія дасягнулі вышынь у прафесіі. На сёння мы маем трох ганаровых прафесараў: галоўны рэдактар «СБ. Беларусь сегодня» Павел Якубовіч, генеральны дырэктар АНТ Рыгор Кісель і міністр інфармацыі Лілія Ананіч. Што датычыцца «зорак» беларускай тэлежурналістыкі, то вы самі бачыце іх па тэлевізары.

— Дарэчы, пра тэлебачанне. На думку дэкана, чаму ў нас так шмат крымінальнай хронікі?

— Тэлеглядач чакае крымінальных сюжэтаў. Некаторыя каналы дзеля прыбытку ідуць на тое, каб задаволіць інтарэсы абывацеля. Гэта праблема не толькі беларускага тэлебачання. Уключыце, напрыклад, НТБ. На расійскіх каналах цэлая школа для злачынцаў. Я лічу, мы пакуль не пераступілі тую мяжу, за якой пачынаецца жоўтая, непрыгожая журналістыка. Мне падабаецца, як вядуць перадачу «Зона Ікс».

— Як вы думаеце, чаму еўрапейскія ідэі не заўсёды прыжываюцца ў беларускай журналістыцы? Напрыклад, бясплатная гарадская прэса. На Захадзе яна разлічана на занятых людзей, якім зручна чытаць навіны па дарозе на працу. У нас жа гэтыя газеты ахапкамі разбіраюць бабулі...

— Пенсіянеры хапаюць газеты, напэўна для таго, каб заўтра завезці іх на свае лецішчы. Чаму не прыжываецца ідэя? Бясплатная прэса разлічана на рэкламадаўцаў, змяшчае шмат аб'яў. Нашы людзі пакуль з недаверам ставяцца да рэкламных выданняў. Але гэтая форма дастаўкі інфармацыі да чытача апрабавана ў Еўропе, ёсць такія газеты ў Расіі. Думаю, у будучыні прыжывецца і ў нас.

— Наколькі сёння ўвогуле запатрабавана прафесія журналіста?

— Кожны год мы выпускаем каля 250 чалавек. Праблем з працаўладкаваннем няма. У нас дастатковая колькасць СМІ, дзе патрэбны маладыя, здольныя спецыялісты. Калі перад размеркаваннем прыходзяць заяўкі, часам на аднаго студэнта прыпадае два месцы. Многія едуць у раённыя і абласныя газеты. Нашы выпускнікі працуюць і ў піяры, у рэкламных службах.

— Можна смела гаварыць пра тое, што ў нас склалася менавіта беларуская нацыянальная школа журналістыкі. У чым яе адметнасць?

— Мы не адстаём ад таго, што робіцца ў Еўропе. Зраўняліся па тэхнічных сродках. Магчыма, нам трэба больш працаваць у напрамку мабільнасці журналістыкі. Але ў параўнанні з краінамі-суседзямі наша журналістыка больш праўдзівая, маральная, чалавечная. Думаю, Заходняй Еўропе таксама ёсць чаму ў нас павучыцца.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ЖУРНАЛІСТЫ Ў МАСТАЦТВЕ

13 яркіх і шматгранных асоб сталі героямі кнігі «Святло блізкіх зорак». Укладальнік — <u>загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, кандыдат філалагічных навук Людміла Пятроўна САЯНКОВА.</u>

Звычайна — прызнаюся ў гэтым упершыню, таму што і разумею некаторую патрэбу ў выданнях такога фармату — калектыўныя кнігі раздражняюць. Ёсць у іх пэўная штучнасць. Розныя аўтары разыходзяцца ў падыходах, жанрах, мастацкім ці публіцыстычным узроўні. «Святло блізкіх зорак», выдадзеная ў «Звяздзе» і прымеркаваная да 70-годдзя Інстытута журналістыкі БДУ (так, вытокі журфака — у 1944 годзе), пасля ўважлівага прачытання пакідае іншае ўражанне.

Па-першае, аўтары... За справу расказаць пра вядомых у краіне творчых асоб узяліся надзвычай дасведчаныя ў самой журналістыцы людзі. Так, жанры для расповеду яны выбралі розныя: літаратуразнаўчыя нарысы, крытычныя агляды, філасофскія эсэ, лірычныя ўспаміны. Аўтары — вучоныя, якія даўно працуюць у тэорыі журналістыкі, абаранілі самыя разнастайныя дысертацыі, напісалі самыя сур'ёзныя манаграфіі. Яны даследуюць журналістыку, назіраюць практыку. Аўтары — і публіцысты, якіх добра ведае чытач. А яшчэ аўтары — блізкія героям людзі: дзеці, нявестка, тыя, хто назіраў сваіх персанажаў у штодзённым жыцці, хто і сёння ў захапленні ад сустрэч, усіх праяў зносін з імі. А героі... Гэта ўжо іншая важная адметнасць. А героі ўсе як адзін — выпускнікі факультэта журналістыкі. І кожны з іх засведчыў сябе ў мастацтве. «Гэтая кніга прысвечана людзям, у чыіх біяграфіях дзве лініі — журналістыка і мастацтва. Усе героі гэтай кнігі былі калісьці выпускнікамі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, і ўсе яны ў далейшым сталі вядомымі дзеячамі культуры і мастацтва. Яны — людзі самых розных творчых прафесій: празаікі, паэты, кінарэжысёры ігравога, дакументальнага і анімацыйнага кіно, публіцысты, сцэнарысты, літаратуразнаўцы, крытыкі. Па сутнасці, гэта нават не прафесіі — мастацтва стала іх сапраўдным прызваннем. Іх напоўніцу можна назваць стваральнікамі мастацкай рэальнасці, паколькі ўсе яны сталі сапраўднымі майстрамі, мастакамі сваёй справы», — чытаем у прадмове «Ад укладальніка».

Усе гэтыя акалічнасці вылучаюць зборнік «Святло блізкіх зорак» з шэрагу іншых калектыўных кніг, робяць усе яго старонкі прывабнымі і рэльефнымі. Мікола Аўрамчык, Святлана Алексіевіч, Анатоль Алай, Алег Белавусаў, Ефрасіння Бондарава, Генадзь Бураўкін, Пятро Васючэнка, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дайнека, Ігар Дабралюбаў, Васіль Зуёнак, Віктар Карамазаў, Анатоль Казловіч, Уладзімір Мехаў, Ганна Краснапёрка, Адам Мальдзіс, Павел Міско, Барыс Сачанка, Янка Сіпакоў, Міхась Стральцоў, Валянцін Тарас, Павел Ткачоў, Іван Чыгрынаў. Такіх людзей, калі ты жывеш у Беларусі і цікавішся беларускай культурай, проста нельга не ведаць.

Усе персанажы вельмі падобныя, блізкія ў галоўным: яны адбыліся як асобы дзякуючы дзівоснай, надзвычайнай працаздольнасці. За жыццё яны паспелі зрабіць вельмі шмат і ў сілу свайго таленту, дадзенага Богам і бацькамі, і ў сілу выключнай адказнасці перад часам. Кожным з іх кіравала разуменне, што іншага часу ў іх не будзе. Не ўсе з іх сутыкаліся адно толькі са спрыяннем у творчых вышуках. Але кожным з іх кіравала адвага, смеласць, творчае гарэнне, асэнсаванне рэчаіснасці і ўласнага месца ў ёй. Таму яны рашуча вырываліся за межы журналістыкі. Таму іх не задавальнялі адно толькі рэдакцыйныя заданні. Яны шукалі тэмы і знаходзілі сябе. У выніку яны выпрацоўвалі свае не толькі творчыя правілы, але і мастацкую, грамадзянскую пазіцыю. Як, напрыклад, пісьменнік, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Барыс Сачанка. Яго дачка і аўтарка эсэ «Бацькавы ўрокі...» Галіна Багданава выразна падкрэслівае пазіцыю свайго героя і ў творчасці, і ў жыцці: «Урок першы. Пісаць шчыра, сумленна, праўдзіва пра ўсё, што любіш і ненавідзіш...»; «Урок другі. Мова — гэта наш інструмент. Чым ён дасканалейшы, тым лепш. Ведаючы ўсе адценні слова, можна лёгка перадаваць усе адценні думкі. Багаты слоўны запас дазваляе быць віртуозам сваёй справы»; «Урок трэці. Для журналіста няма нецікавых тэм і жанраў»; «Урок чацвёрты. Журналіст мусіць падымаць праблему, нават калі няма надзеі на яе вырашэнне»; «Урок пяты. Калі не хапае аргументаў з жыцця, шукай іх у мудрых кніжках...».

Многія старонкі пра «зорак», выпеставаных на факультэце журналістыкі, носяць «звяздоўскі» характар: журналісты ці толькі друкаваліся, ці працавалі ў «Звяздзе»... Як лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Віктар Карамазаў. Як і празаік Павел Міско. Шчымліва, вельмі эмацыйна расказвае пра яго ў эсэ «Дрэва жыцця Паўла Міско» дачка — Марына Сідаровіч, якая сама працуе ў «Звяздзе» стылістычным рэдактарам.

Ёсць яшчэ адна агульная акалічнасць, якая яднае, цэментуе кнігу, — героі нарысаў, эсэ, творчых партрэтаў не баяліся ўступіць у канфлікт, мужна адстойвалі свае перакананні, выказвалі свой уласны пункт гледжання, як бы гэта цяжка часам не давалася. У журналістыцы, як і ў мастацтве, без гэтага не абысціся.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 15 декабря 2014 года повторных торгов с условиями по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскгрузавтотранс»

Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)	- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-5932, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7 («административно-производственный корпус А 1/к; Б 1/к» общей площадью 544 кв. м); - капитальное строение с инвентарным номером 500/С-13097, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 7/1 («производственный корпус № 2 с пристройкой В 1/к; Г 1/К» общей площадью 137 кв. м); - тепловая сеть, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7; - сеть электроснабжения, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7; - дворовые сооружения, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 7 (инвентарный номер 000119)
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер – 500000000003000226, площадь – 0,1934 га
Продавец имущества	ОАО «Минскгрузавтотранс», ул. Минина, д. 21, к. 2, 220014, г. Минск
Организатор торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	6 687 268 000 рублей
Сумма задатка	600 000 000 белорусских рублей
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов
Наличие обременений	Аренда

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскгрузавтотранс», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **15 декабря 2014 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 03.12.2014 по 11.12.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)226-24-11, (029)685-04-58 (ОАО «Минскгрузавтотранс»).

Ігуменскі тракт
№ 38 (96)

■ Імя ў гісторыі

ХІМІК І ПАЛІТЫК З МОТАЛЯ

Гаворка пра Хаіма Вейцмана, ураджэнца беларускага мястэчка Моталь, выпускніка Пінскага рэальнага вучылішча, славутага вучонага-хіміка, уладальніка больш за сто патэнтаў у галіне прымянення хімічных працэсаў, заснавальніка навуковай школы ў Ізраілі, выдатнага грамадскага і палітычнага дзеяча, першага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль.

Вейцман шмат у чым увасабляе яўрэйскую гісторыю першай паловы XX стагоддзя. Ураджэнец яўрэйскага мястэчка ў мяжы аселасці, ён дасягнуў міжнароднага прызнання як навуковец і як лідар яўрэйскага нацыянальнага вызваленчага руху і памёр на пасадзе прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль, стварэнню якой ён прысвяціў усё сваё жыццё.

У час Першай сусветнай вайны ён вынайшаў новы танны спосаб атрымання лёгкаўзгаральнага ацэтону, які ўжываўся для вытворчасці боепрыпасаў, што было высока ацэнена англійскім урадам. У гады Другой сусветнай вайны Вейцман распрацаваў танны метад атрымання сінтэтычнага каўчуку, што таксама вельмі дапамагло Англіі і саюзнікам. Уплыў Вейцмана ў свеце быў велізарны. Праз два дні пасля абвяшчэння яўрэйскай дзяржавы ён атрымаў прапанову стаць яе прэзідэнтам.

У рамках Дзён Хаіма Вейцмана ў Беларусі 27 лістапада 2014 года ў Моталі, на яго радзіме, і нават у доме, дзе ён нарадзіўся, прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 140-годдзя з дня яго нараджэння.

Ізраільскі культурны цэнтр пры Пасольстве Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь прадставіў у клубе аграгарадка Моталь выставы. «Цуды часам здараюцца, але над гэтым трэба добра папрацаваць» (пра Хаіма Вейцмана, ураджэнца Беларусі, першага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль, вядомага вучонага і дзяржаўнага дзеяча); «Ізраіль — краіна інавацый» (пра ізраільскія адкрыцці і распрацоўкі апошніх гадоў, пра дасягненні навуковай і тэхнічнай думкі Дзяржавы Ізраіль, ля вытокаў якой стаяў Хаім Вейцман).

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Іосіф Шагал на адкрыцці выставы сказаў: «Я бясконца ўдзячны за тую ўвагу да памяці, да аўтарытэту вашага земляка і нашага прэзідэнта, першага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль. Гэта жэст не проста добрай волі — гэта прыгожы, правільны падыход да таго, што з'яўляецца часткай гісторыі Ізраіля і, я ў гэтым пераконваюся тут, часткай гісторыі гэтага цудоўнага месца».

Паводле слоў пасла, Хаім Вейцман — унікальная фігура. Ён насамрэч не палітык і ніколі палітыкам не быў. Ён навуковец, аўтарытэт якога быў выкарыстаны пры стварэнні дзяржавы. Калі б не яго асабістыя сувязі з урадам Вялікабрытаніі, у прыватнасці, з прэм'ер-міністрам, дэкларацыя Бальфура, якая ў выніку прывяла да стварэння дзяржавы Ізраіль, не прагучала б так важка. «Рэчы, якімі мы карыстаемся, рэчы, якімі сёння ганарыцца цывілізацыя, былі створаны ў маленькай-маленькай краіне, якую на карце Блізкага Усходу пальцам закрыць можна. І я думаю, што гэта прадмет нашага з вамі агульнага гонару, што пачатак гэтай краіны, і галоўныя навуковыя асновы яе закладваў ваш зямляк і вялікі прэзідэнт спадар Хаім Вейцман», — сказаў Іосіф Шагал.

У рамках урачыстых мерапрыемстваў быў падпісаны пратакол паміж старшынёй Іванаўскага раённага выканаўчага камітэта Юрыем Бісунам і Паслом



Паштоўку да 140-годдзя Вейцмана зрабіў Уладзімір Цэслер.

Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Іосіфам Шагалам, кіраўніком Яўрэйскага агенцтва для Ізраіля «Сохнут» у Беларусі Алегам Добкіным, рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Ганнай Сендар, кіраўніком аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргеем Мусіенкам. Пратакол уключае ўдзел ізраільскай дэлегацыі ў фестывалі «Мотальскія прысмакі»; закладку алеі дрэў для ганаровых гасцей (першай плануецца пасадзіць сасну з Ізраіля каля дома Вейцмана ў Моталі), адкрыццё плошчы (ці вуліцы) імя Хаіма Вейцмана ў Моталі; установу ў Моталі памятнага знака аб Хаіму Вейцману; установу каля дома Вейцмана ў Моталі флагштокаў з дзяржаўнымі сцягамі Ізраіля і Беларусі.

Сяргей Мусіенка прапанаваў правесці ў Моталі сумесна з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях першую беларуска-ізраільскую навукова-практычную канферэнцыю імя Хаіма Вейцмана. «Мая канцэпцыя не змянілася — у Моталі патрэбна стварыць музей першага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль. Інакш нельга. Не губляю надзеі знайсці правільнага чалавека, для якога рэалізацыя гэтага праекта стане знакавай і такой жа значнай, як і для мяне, справай», — сказаў Сяргей Мусіенка.

Пасля Моталя выставы Ізраільскага культурнага цэнтра пераедуць у Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна. Аналітычны цэнтр ЕсооМ і Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Беларусі прыступілі да падрыхтоўкі візіту беларускіх навукоўцаў, работнікаў вытворчасці і спецыялістаў у Ізраіль. Вядомы дызайнер Уладзімір Цэслер зрабіў памятную паштоўку да юбілейнай даты, адбылося яе спецгашэнне на мясцовай пошце.

Такое развіццё падзей, напэўна, вельмі ў духу нашага вялікага земляка Хаіма Вейцмана.

Адам ПЯТРОВІЧ

■

Пунш, заморскі дзядзька крупніку

Няўмольна надыходзяць халады, дык ці не самы час зараз сагрэцца гарачым пуншам? Пунш — змяшаны алкагольны напой. Родам ён з Паўднёвай Азіі і распаўсюдзіўся ў Еўропе з пачатку XVII стагоддзя дзякуючы англічанам і галандцам. Назва паходзіць ад санскрыцкага слова «панч» (англ. punch), — «пяць», бо ў састаў пуншу пачаткова ўваходзіла 5 абавязковых кампанентаў: паўднёваазіяцкі арак, пра які мы ніжэй пагаворым, цукар, спецыі, цытрына (або іншыя цытрусавыя) і віно (радзей вада). Гарачы пунш падаюць нагрэтым да 65°С. Напой гатуюць у зачыненым посудзе (можна ў эмаляваным рондлі, але традыцыйна — у адмысловай вазе з вечкам), награваючы яго прыкладна да 70°С. Пры больш высокай тэмпературы губляюцца смакавыя якасці віна і выпарваецца прыкметная частка спірту. Падаюць пунш гарачым (радзей астуджаным) у керамічных кілішках або ў шклянках для гарбаты.

Ідэя спалучаць пунш з чаем, мабыць, зарадзілася ўжо ў Еўропе, дзе і тое, і другое асацыявалася з Усходам, а значыць, аўтаматычна пасавала адно аднаму. Да таго ж моду на пунш задавалі Англія і Галандыя, адкуль распаўсюджвалася і мода на чай, прычым прыкладна ў адзін і той жа час. Ды і цёмны колер араку, які застаецца ад трыснёговай меласы, даволі блізкі да чайнага.

Адна са шматлікіх карцін з сатырычным малюнкам пуншавай вечарыны, напісаная ў манеры У. Хогарта.

Спачатку пунш далівалі ў чай як араматычны дадатак, а затым і сам пунш часта сталі гатаваць, дадаючы чай, можна нават сказаць, з дамінуючым чайным смакам. Рэцэптура стала досыць вольнай, далёкай ад арыгінала. Напрыклад, арак сталі замяняць спачатку больш даступным ромам, а потым, часта, і любым моцным алкаголем, які трапляўся пад руку. Акрамя цытрыны і іншых цытрусавых, сталі выкарыстоўваць іншую садавіну і фруктовыя сокі. Free style. Пунш з яго дарагімі кампанентамі быў напоем прынцыпова не даступным для абсалютнай большасці. Славуты англійскі мастак Уільям Хогарт пакінуў нашчадкам сатырычны сюжэт, які не надта падыходзіць да снобаў — аматараў пуншу. Гэтую яго гравюру часта перамалёўвалі ў розных краінах, часам не вельмі блізка да арыгінала, у тым ліку і на дне парцалянавых ваз для пуншу.

Самы дарагі кампанент традыцыйнага пуншу — гэта арак. У нас ён з'явіўся ў сярэдзіне XVIII стагоддзя дзякуючы імпарту з галандскай Батавіі (цяпер сталіца Інданезіі Джакарта) і індыйскага Гоа, якія не абміналі галоўны порт Рэчы Паспалітай — Гданьск. Адтуль і распаўсюдзілася, досыць хутка, мода на пунш. Арак з Батавіі і арак з Гоа (значна больш рэдкі і да нашага часу практычна «вымер») — розныя напоі. Батаўскі робіцца з меласы цукровага трыснягу (як і ром), а ферментацыя адбываецца дзякуючы дражджам з дададзенымі ў яго сухарамі з чырвонага рысу. А індыйскі і цэйлонскі арак — з какосавага соку. І той, і гэты арак потым пераганяюць. Слова «арак», зрэшты, вядомае практычна па ўсёй Азіі: на Блізкім Усходзе так называюць моцны дыстыляваны напой з вінаграду, араматызаваны анісам. У Іраку яго робяць з соку фінікаў, а ў цюркскіх народаў арак — гэта дыстыляваны кумыс. Але для традыцыйнага пуншу ўжываецца толькі паўднёваазіяцкі арак (з Індыі, Інданезіі або Цэйлона).

Аж да пачатку XX стагоддзя арак лічыўся адным з напояў, які павінен быў абавязкова прысутнічаць у «аптэчцы прыёмнай» кожнага прыстойнага шляхецкага дома — у адмысловай, замкнёнай на ключ шафцы, папярэдніцы сучасных бараў. У ёй таксама трымалі спецыі, цукеркі і іншыя далікатэсы. Акрамя пуншу, арак выкарыстоўваўся як кампанент для соусаў да мяса і птушкі, для насычэння выпечкі (у першую чаргу, дражджавых «баб»), дадаваўся ў каву і гарбату. Піла яго шляхта і ў чыстым выглядзе, але часцей разбаўлены фруктовымі сокамі. Увогуле, ужывалі яго больш ці менш як ром, да якога ён даволі блізкі і зыходным саставам і смакам.

Пунш «палаючы»

Складнікі: *1 -1,5 кг фруктовага марозіва, 750 мл белага віна, 200 мл араку (або рому).*

Спосаб прыгатавання: разліць па кубках або кілішках віно на 1/3 вышыні. Выкласці на паверхню 2-3 лыжачкі марозіва. Заліць аракам і падпаліць. Можна перад падпалам дэкараваць таксама скрылькамі фруктаў, лісцем мяты, кроплямі канфіцюру і гэтак далей.

■ Год гасціннасці: вывучаем маршруты

Таямніцы Чырвонага касцёла

Што пра святыню не раскажа звычайны экскурсавод?

Касцёл святых Сымона і Алены, які здаўна празвалі Чырвоным, — сапраўдная архітэктурная перліна сталіцы. Убачыць яго выяву можна не толькі на паштоўках, але і на майках, кубках і ўлюбёных усімі магнітах. Аднак вось і парадокс: выбраць асобную экскурсію, як гэта здаўна практыкуюць за мяжой, атрымалася няпроста. Звычайна Чырвоны касцёл разглядаецца як толькі частка ў вялікім маршруце па сталіцы. Але мы сваёй мэты дасягнулі: знайшлі экскурсійную аб'яву ў самім касцёле і пад выглядам турыстаў у мінулую суботу завіталі ў знакамітую каталіцкую святыню.

АНГЛІЧАНІН, ЯКІ ПАЛЮБІЎ БЕЛАРУСЬ

Ля галоўнага ўвахода нас сустракае **Галіна ІВУЦЬ,** якая не толькі ладзіць экскурсіі па храме для ўсіх ахвотных, але і апякуе мясцовую бібліятэку імя Адама Міцкевіча.

— Праводзіць экскурсіі мы пачалі ў 2002 годзе, калі пры парафіі стварылі навуковы цэнтр па даследаванні Турынскай плашчаніцы, копія якой знаходзіцца ў нашым касцёле. Спачатку чыталі лекцыі аб плашчаніцы, а пасля вырашылі, што людзям трэба таксама больш падрабязна расказваць пра наш родны касцёл. Першымі наведвальнікамі сталі парафіяне, а неўзабаве пачалі падцягвацца ўсе ахвотныя: ад вучняў, студэнтаў да супрацоўнікаў міністэрстваў, замежных турыстаў і прадстаўнікоў дыпмісій.

Але перад тым як убачыць копію плашчаніцы, галоўную рэліквію касцёла, спадарыня Галіна спыняе нас каля пліты непадалёк ад увахода. Пад фігурай Ісуса Хрыста знаходзіцца прах Эдварда Вайніловіча, фундатара касцёла і вядомага палітычнага дзеяча Расійскай імперыі. Справа ў тым, што пасля Рыжскага мірнага дагавора яму прыйшлося пераехаць на сталае месца жыхарства ў Польшчу. Ён асеў у Быдгашчы, дзе і памёр у 1928 годзе. Праўда, 8 гадоў таму дзякуючы намаганням ксяндза Уладзіслава Завальнюка, пробашча парафіі святых Сымона і Алены, касцёльных іерархаў, міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Польшчы прах Вайніловіча перавезлі на яго радзіму. Між іншым у будучыні фундатар Чырвонага касцёла можа стаць першым бласлаўлёным нашым суайчыннікам з ліку свецкіх асоб. Беатыфікацыйны працэс Вайніловіча ўжо распачаты.

Злева ад пахавання заснавальніка касцёла знаходзіцца капсула з прахам Гая Пікарды, англійскага юрыста па адукацыі, які даследаваў беларускія песнапенні, творчасць Францыска Скарыны, быў членам журы конкурсу харавога мастацтва «Магутны Божа». Менавіта Пікарда стаў першым замежнікам, які захацеў, каб яго пахавалі ў Беларусі. Аказваецца, з нашай краінай сям'ю Пікарды звязваюць даўнішнія «адносіны».

— Падчас руска-французскай вайны 1812 года яго прашчур служыў у войску Напалеона, — расказвае наш экскурсавод. — Вядома, вялікая колькасць французаў загінула якраз на Беларусі. Падобны лёс мог напаткаць і сваяка Гая, калі б не беларуска, якая вылечыла параненага француза.

Фота Надзеі БУЖАН.

Крыж і піуска Яна Паўла II захоўваюцца ў бакавым алтары.

«ЛЮДЗІ АЗДАРАЎЛЯЮЦЦА ПАСЛЯ МАЛІТВЫ ПЕРАД ПЛАШЧАНІЦАЙ»

У касцёле пакуль нешматлюдна. Некалькі вернікаў укленчылі перад алтаром, астатнія набываюць літаратуру ў кіёску. Да копіі Турынскай плашчаніцы ісці праз увесь касцёл не трэба. На ўваходзе паварочваеш направа і праз некалькі крокаў бачыш вялікае зашклёнае палатно. Да нас далучаюцца некалькі масквічоў, якія зайшлі ў касцёл са сваім экскурсаводам.

— Гэта копія савана, у які, згодна з паданнем, пасля смерці быў абгорнуты Ісус Хрыстос. Арыгінал знаходзіцца ў Турыне. Усяго зроблена 7 поўнамаштабных копій плашчаніцы. Большасць з іх знаходзіцца ў закрытых кляштарах, і далёка не кожны можа патрапіць да яе, каб памаліцца. Беларускімі навукоўцамі ўжо даказана, што нават копія мае добрую энергетыку. І я ведаю людзей, якія дзякуючы веры і малітве перад мінскай копіяй плашчаніцы аздараўляліся не толькі духоўна, але і фізічна.

